

ДЗЕ «ТУСЯЦЬ» СУЧАСНЫЯ ДЗЕЦІ

ЧЫРВОНКА

«СВАІМ 54-М ПАМЕРАМ ЦАЛКАМ ЗАДАВОЛЕНА»

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 СНЕЖНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 241 (29108)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*«Мясцовая ўлада заўсёды павінна абапірацца на літару закона. Хоць часам трэба прымаць у тым ліку і нейкія нестандартныя рашэнні. Але самае галоўнае патрабаванне — пазбавіцца ад суб'ектывізму ў рабоце. Ні ў якім разе нельга кіравацца асабістымі меркаваннямі: «Я проста не хачу падоўжыць ім дагавор, таму не буду». Калі гэтыя факты будуць мець месца, то рэакцыя будзе жорсткая».*

## КАРАТКА

**• У Лепельскім раёне зацвілі пралескі.**

• Старшынёй Беларускага саюза мастакоў абраны Глеб Отчык.

**• Забяспечыць усіх спажыўцоў у Беларусі якаснай пітной вадой плануецца да 2025 года.**

• Лістапад 2019 года стаў другім сярод самых цёплых за апошнія амаль 150 гадоў.

**• Міністэрства аховы здароўя плануе спрасціць праходжанне вадзіцельскай камісіі.**

• Больш за 350 кватэр для медработнікаў плануюць пабудаваць у Мінскай вобласці ў 2020 годзе.

**• Праграму па дыстанцыйным навучанні інвалідаў рэалізуюць у Магілёве.**

• Прэзідэнцкая бібліятэка Турцыі атрымала ў дар калекцыю беларускіх кніг.

**• У Гродне рэканструююць закінуты чыгуначны мост у аўтамабільны.**

Фота БелТА.

# ХУТКА, ХУТКА НАВАСЕЛЛЕ

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў два ўказы, якія многім дапамогуць рашыць кватэрнае пытанне

**У адпаведнасці з указам аб будаўніцтве жылых дамоў у гарадах-спадарожніках устанаўліваецца парадак будаўніцтва жылля ў гарадах-спадарожніках Мінска для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў у сталіцы.**

Згодна з Указам ад 15 сакавіка 2019 года № 103 у Смалявічах у парадку эксперымента пачата будаўніцтва жылога дома для мінчан, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Сутнасць эксперымента заключалася ў тым, што гэтым грамадзянам незалежна ад даты іх пастаноўкі на ўлік аказана дзяржаўная падтрымка ў выглядзе субсідый. У працэсе фарміравання спіса дольшчыкаў гэтага жылога дома мінчане праявілі вялікую цікавасць да будаўніцтва жылля на названых умовах.

СТАР. 2

# КОЛЕР НАСТРОЮ — ВЯСНОВЫ

**На шпульках машыны швачкі пашывачнага цэха Жлобінскай швейнай фабрыкі Настассі ДУБІНСКАЙ *(на фота)* зусім не характэрныя для гэтай пары года ружовыя ніткі. Але тое не дзіўна, бо прадпрыемства, на якім працуе Настасся, ужо пачало шыць вясновую калекцыю адзення для школьнікаў. Тут распрацавалі каля дзясятка ўзораў дэмісезоннага адзення, шыюць якое, дарэчы, з тканін Мінскага камвольнага камбіната. Першыя курткі і паліто для падлеткаў з'явяцца ў крамах ужо ў студзені.**

Фота БелТА.

## Шануй сваё

**Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ:**

# «Краязнаўства — справа кожнага»

**Беларускі фонд культуры — адна з найстарэйшых грамадскіх арганізацый, што падтрымліваюць нацыянальную культуру. Сярод прыярытэтных кірункаў яго дзейнасці знаходзяцца падтрымка і папулярызацыя народнага мастацтва, музейнай і бібліятэчнай справы, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама краязнаўства. Пра важныя дасягненні, бачанне перспектыў развіцця і захаванне назапашанага вопыту «Звязда» гутарыць са старшынёй БФК Тадэвушам СТРУЖЭЦКІМ.**

СТАР. 13

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2020 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**

ISSN 1990 - 763X

# ХУТКА, ХУТКА НАВАСЕЛЛЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падпісаны ўказ распаўсюдзіў умовы будаўніцтва жылога дома ў Смалявічах, прадугледжаныя Указам № 103, і на будаўніцтва жылля ў іншых гарадах-спадарожніках Мінска: Дзяржынску, Заслаўі, Лагойску, Фаніпалі, Рудзенску.

У прыватнасці, устанаўліваецца, што будаўніцтва жылых дамоў ажыццяўляецца долевым спосабам з уключэннем іх у графік фінансавання жылых дамоў па Мінскай вобласці, якія ўзводзяцца з дзяржаўнай падтрымкай. Фарміраванне спіса дольшчыкаў ажыццяўляецца з улікам даты пастаноўкі грамадзян на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Незалежна ад даты пастаноўкі на ўлік дольшчыкам аказваецца дзяржаўная падтрымка пры будаўніцтве гэтага жылля.

Грамадзяне, якія пабудавалі кватэры ў гарадах-спадарожніках, здымаюцца з уліку ў Мінску. Жыхары сталічных гарадоў-спадарожнікаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, таксама змогуць пабудаваць кватэры ў такіх дамах на аналагічных умовах.

**Другі падпісаны Прэзідэнтам указ датычыцца забеспячэння жыллём шматдзетных сем'яў.**

«Дакумент накіраваны на скарачэнне на працягу двух гадоў чаргі шматдзетных сем'яў у Мінску і выкананне патрабавання кіраўніка дзяржавы аб накіраванні з 2021 года такіх сем'яў на будаўніцтва жылля на працягу аднаго года з даты іх пастаноўкі на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў», перадае прэс-служба Прэзідэнта.

У 2020—2021 гадах для шматдзетных сем'яў, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, прадугледжваецца будаўніцтва аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў на перспектыўных пляцоўках у мікрараёнах Сокал, Чыжоўка, жылым раёне паблізу вёскі Зацань. Дакументам таксама прадугледжаны продаж жылых памяшканняў ва ўведзеных у эксплуатацыю шматкватэрных жылых дамах ДВА «Мінскбуд», продаж 300 кватэр з ліку перададзеных забудоўшчыкамі ў камунальную ўласнасць Мінска ў кошт сярэдзіннага паказчыка зносу, а таксама пабудаваных Мінскім гарвыканкамам для адсялення грамадзян са старых і аварыйных дамоў.

Магчыма таксама аказанне дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах, якія ўзводзяцца па індывідуальных праектах. Гэтым шанцам можна скарыстацца толькі пры будаўніцтве жылля, што ўзводзіцца з прымяненнем праектаў эканамічных жылых дамоў тыповых спажывецкіх якасцяў.

На ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў у сталіцы стаяць 5847 шматдзетных сем'яў, у тым ліку 1811 сем'яў — больш за тры гады.

# 2 СТУДЗЕНЯ — ВЫХАДНЫ ДЗЕНЬ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 17 снежня падпісаў указ, у адпаведнасці з якім прадугледжваецца замацаванне на пастаяннай аснове ў якасці непрацоўнага святочнага дня 2 студзеня (без неабходнасці яго адпрацоўкі). Пра гэта паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**




## Блізкая ўлада

# ІСЦІ ДА ЛЮДЗЕЙ

**Кіраўнікі тэрыторый, розных службаў павінны цалкам выключыць няўважлівае стаўленне да пытанняў, з якімі звяртаюцца людзі. На гэтым зрабіў акцэнт падчас прамой тэлефоннай лініі старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ, перадае БелТА.**

Фота БелТА.

За час трохгадзіннага дыялогу губернатара з жыхарамі рэгіёна паступіла 45 званкоў, якія датычыліся розных сфер. Так, на прамую лінію звярнуўся гамяльчанін, які пражывае па вуліцы 60 гадоў СССР. Ён паскардзіўся на круты спуск пандуса ў доме. «Паглядзіце, што там можна зрабіць, каб быў мінімальны ўхіл. Магчыма, часова абсталюйце драўляны, пакуль умовы надвор'я не дазваляюць зрабіць бетонны. Разбярыцеся грунтоўна», — паставіў задачу кіраўнік рэгіёна перад адміністрацыяй раёна.

Неаднаразова гучала тэма дарог. Напрыклад, жыхар абласнога цэнтра паскардзіўся на стан дарогі паміж вёскамі Краўцоўка і Дзікалаўка ў Гомельскім раёне. «Гэта роўна тры кіламетры ўздоўж возера. Ехаць па ёй нельга. Сабраны 74 подпісы ад людзей. Як вырашыць гэтае пытанне?» — агучыў праблему заяўнік. Генадзь Салавей пагадзіўся, што многія дарогі ў Гомельскім раёне маюць патрэбу ў рамонце. «Ужо выдзелены грошы для тых, стан якіх патрабаваў першачарговага ўмяшання. Звернем увагу і на названы ўчастак», — запэўніў старшыня аблвыканкама.

Яшчэ адно праблемнае месца, дзе складана праехаць, — вёска Гдзень Брагінскага раёна. «Трэба прыбраць хмызнякі — няма агляду на дарозе, прайсці грэйдэрам», — прасіў вясковец, які патэлефанаваў на прамую лінію. Даручэнне прапрацаваць вырашэнне пытання дадзена адказным службам.

Жыхарка аграгарадка Тонеж Лельчыцкага раёна расказала, што ўжо паўтара года на пенсіі, да гэтага часу працавала прыбіральшчыцай у школе. У нейкі момант даведалася пра вакансію тэхнічкі ва ўстанове. «Хацела ўладкавацца. Сілы ёсць, яшчэ і папрацаваць магу», — адзначыла жанчына, аднак разумення з дырэктарам школы яна не знайшла. Губернатар паставіў задачу разабрацца ў гэтай сітуацыі.

Жыхар 5-га мікрараёна Гомеля звярнуў увагу на санітарны стан тэрыторыі ў адной з буйных крам. Ёсць у яго сумневы і адносна правільнасці захоўвання прадукцыі. «Кіраўніку адміністрацыі раёна пастаўлена задача навесці парадак на працягу тыдня», — адзначыў старшыня Гомельскага аблвыканкама.

Станам праводкі ў пад'ездах некалькіх дамоў занепакоены яшчэ адзін гараджанін. З гэтым пытаннем ён ужо звяртаўся ў КЖРЭУП «Савецкае», аднак сітуацыя не змянілася. «Гэта бяспека людзей, разбяромся», — падкрэсліў Генадзь Салавей.

Пытанні да камунальных службаў гучалі неаднаразова. Па названых адрасах аператыўна выехалі камісіі спецыялістаў.

«Праблемы, пра якія гаварылі жыхары вобласці, ідуць ад жыцця. Практычна ўсе ўзнятыя тэмы — зона адказнасці кіраўнікоў тэрыторый, службаў, дзе павінна быць цалкам выключана няўважлівае стаўленне да праблем, з якімі звяртаюцца людзі. Там, дзе ёсць на месцах улада, пытанні бытавога, камунальнага і многіх іншых кірункаў вырашаюцца. Калі ж тэма складаная для раённага ўзроўню, мы, вядома, разгледзім яе на абласным. Трэба ісці да людзей і вырашаць праблемы, якія ёсць», — перакананы старшыня Гомельскага аблвыканкама.

Генадзь Салавей таксама адзначыў, што ў вобласці практыкуюць выязныя прыёмы грамадзян, каб жыхары раёнаў змаглі прыйсці па месцы жыхарства і агучыць тэмы, якія іх хвалююць. Губернатар звярнуў увагу, што дзякуючы шматвектарнай рабоце са зваротамі насельніцтва намецілася тэндэнцыя да іх скарачэння.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Boeing прыпыніць вытворчасць лайнера 737 Max

Авіякампанія абвясціла, што прыпыніць вытворчасць авіялайнераў адпаведнай серыі са студзеня 2020 года. Нягледзячы на тое, што эксплуатацыя самалёта была прыпыненая з-за дзвюх авіякатастроф, якія адбыліся ў апошнія гады, Boeing працягваў выпуск 737 Max. Аналіз, праведзены Федэральным упраўленнем грамадзянскай авіяцыі ЗША, паказваў, што падчас далейшай эксплуатацыі самалёта магло б адбыцца не менш за дзясятак такіх жа катастроф, калі ў канструкцыю 737 Max не будуць унесеныя змяненні.

### Армія Пакістана выступіла супраць рашэння суда, які вынес смяротны прысуд экс-прэзідэнту

Узброеныя сілы Пакістана выказалі сваю нязгоду з рашэннем Спецыяльнага суда па справе аб дзяржаўнай здрадзе былога прэзідэнта Пакістана Первеза Мушарафа. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай заяве армейскай прэс-службы. «Належная прававая працэдура была праігнараваная, — паведамляецца ў заяве. — Узброеныя сілы Пакістана чакаюць, што правасуддзе будзе здзейснена ў адпаведнасці з канстытуцыяй Ісламскай Рэспублікі Пакістан». Раней газета Dawn паведаміла, што Спецыяльны суд Пакістана прысудзіў Мушарафа, які знаходзіцца цяпер у ААЭ, да смяротнага пакарання па справе аб дзяржздрадзе.

### Жанчынам спатрэбіцца яшчэ каля ста гадоў, каб дамагчыся гендарнай роўнасці

Да такой высновы прыйшлі спецыялісты швейцарскай няўрадавай арганізацыі Сусветны эканамічны форум. У справаздачы навукоўцы прааналізавалі адрозненні паміж мужчынам і жанчынай у 153 краінах. «На цяперашні момант недастаткова жанчын прадстаўлена ў тых сферах, дзе заработная плата расце хутчэй за ўсё, — адзначыла кіраўнік даследаванняў па гендарнай роўнасці пры Сусветным эканамічным форуме Саадзія Західзі. — У сферы воблачных вылічэнняў задзейнічана ўсяго 12 працэнтаў жанчын. Што датычыцца спецыялістаў па штучным інтэлекце, там іх 26 %, у інжынерыі — каля 15». Сусветны рэйтынг па гендарнай роўнасці сёлета, як і летась, узначальвае Ісландыя. Унізе спіса — Пакістан, Ірак і Емен.

## Заканатворчасць

# Паварот з пакарання на прафілактыку

**У новым Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях плануецца перагледзець некаторыя санкцыі і правапрымяняльную практыку. Пра гэта паведаміла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС падчас рэспубліканскай каардынацыйнай нарады па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй.**

Па словах Вольгі Чупрыс, работа над праектамі Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях вядзецца вельмі актыўна. Да яе далучаныя кіраўнікі дзяржаўных органаў, парламентарыі, навукоўцы, юрысты-практыкі.

«Мы чакаем істотнага выніку па распрацоўцы двух цалкам новых кодэксаў, — цытуе Вольгу Чупрыс БелТА. — Нам неабходна вызначыцца, як мы падзелім адміністрацыйныя правапарушэнні. Яны будуць градзіраваны на некалькі відаў па аналогіі з Крымінальным кодэксам: менш цяжкія, больш цяжкія».

У новым КаАП будуць перагледжаны санкцыі, некаторыя з іх стануць мякчэйшыя. Магчыма, асобныя правапарушэнні будуць аднесены да катэгорыі нязначных і пазбавяцца падстаў для прыцягнення да адказнасці. Такая норма ёсць і сёння, але, па словах намесніка кіраўніка Адміністрацыі, яна працуе не зусім добра.

Зараз вывучаецца практыка прыцягнення да адказнасці. Эксперты лічаць, што адміністрацыйны працэс павінен быць больш хуткі і не павінен выклікаць цяжкасці. «Калі, напрыклад, грамадзянін гатовы аплаціць штраф на месцы, то гэта не павінна служыць перашкодай для яго далейшага прасоўвання па службе: ён прызнаў віну, і гэта не з'яўляецца тым правапарушэннем, якое павінна мець для яго сур'ёзныя наступствы», — растлумачыла Вольга Чупрыс.

Акрамя таго, у асобным раздзеле кодэкса плануецца абагульніць работу, звязаную з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў фіксацыі правапарушэнняў. «Цяпер гэтыя нормы адасобленыя. Калі яны будуць згрупаваныя, то практыка пойдзе ўжо іншым шляхам: адкрыў, паглядзеў, аператыўна ўжыў», — сказала намеснік кіраўніка Адміністрацыі.

Нагадаем, 16 снежня Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях прымянення мер адміністрацыйнай адказнасці. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: галоўным крытэрыем работы павінна быць не колькасць выяўленых парушэнняў і выпісаных штрафаў, а прафілактычнае ўздзеянне і рэальнае скарачэнне адміністрацыйных правін.

# КАШТОЎНЫ ЎКЛАД У БУДУЧЫЯ ПЕРАМОГІ

## У зале алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта прайшла цырымонія ўручэння імянных пасведчанняў стыпендыятам Прэзідэнцкага спартыўнага клуба

**У 2020 годзе імі стануць 192 спартсмены і 72 трэнеры-выкладчыкі. Гэта прадстаўнікі 31 віду спорту. Сярод стыпендыятаў 157 атлетаў падымаліся на подыум найбуйнейшых міжнародных спаборніцтваў у сваіх узростах, 34 спартсмены будуць стыпендыятамі другі год запар, толькі сем з іх пагоршылі свае вынікі адносна мінулага года.**

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Стыпендыяткамі сталі і юныя надзеі беларускага веславання.

«Стыпендыя Прэзідэнцкага спартыўнага клуба можа стаць важнай прыступкай на вашым нялёгкім шляху ў свет вялікага спорту. Восем алімпійскіх чэмпіёнаў нашай краіны ўжо скарысталіся ёй, — адзначыў **старшыня Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.** — Упэўнены, што сярод вас ёсць тыя, хто зможа папоўніць гэтыя пераможныя шэрагі. Напэўна, вы намецілі сабе самыя высокія мэты, і вас не трэба дадаткова матываваць. А вось падтрымка лішняй не будзе». Дзмітрый Аляксандравіч дадаў, што сярод цяперашніх удзельнікаў праекта рэкордная колькасць трэнераў, нягледзячы на юны па трэнерскіх мерках узрост (стыпендыятамі яны могуць станавіцца толькі да 41 года), хтосьці ўжо падрыхтаваў чэмпіёнаў свету. «Некаторыя з вас самі маюць вопыт заваявання сур'ёзных вышынь, аж да п'едэстала Алімпійскіх гульняў. Пераемнасць пакаленняў — залог пераможных традыцый. Менавіта таму мы аддаём асаблівую ўвагу маладым і перспектыўным трэнерам нашай краіны».

Памер стыпендыі залежыць ад месца, якое заняў спартсмен, і ад таго, ці з'яўляецца яго від спорту алімпійскім. Самая вялікая прызначаная гадавая стыпендыя на 2020 год — 16 800, мінімальная — 2 000 рублёў. Трэнеры атрымліваюць аднолькавую стыпендыю, якая прыкладна адпавядае значэнню сярэдняй стыпендыі спартсменаў на гэты год. Агульная сума стыпендый на 2020 год — 1 774 980 рублёў.

У цырымоніі ўручэння імянных стыпендый прынялі ўдзел першы віцэ-прэзідэнт НАК Віктар Лукашэнка, міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы Марына Лобач.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Агульная спадчына

# МУЗЫКА МІЖНАРОДНАГА ДЫЯЛОГУ

**У Міністэрстве замежных спраў адзначылі 200-годдзе з дня нараджэння Станіслава Манюшкі.**

Бягучы год афіцыйна аб'яўлены ЮНЕСКА годам кампазітара, а юбілей уключаны ў сёлетні Спіс памятных дат арганізацыі.

На святочнай цырымоніі прысутнічаў **міністр замежных спраў Беларусі, старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзімір МАКЕЙ.**

Імпрэза завяршае план мерапрыемстваў (іх было каля 70), падрыхтаваных ведамствам з нагоды юбілею.

Па словах міністра, уключэнне даты нараджэння кампазітара ў спіс свят ЮНЕСКА сведчыць аб тым, якое значэнне мае яго імя для сусветнай культуры.

«І такіх імён, як Станіслаў Манюшка, у нашай гісторыі нямала. Мы можам назваць і Адама Міцкевіча, і Ігната Дамейку, і Кастуся Каліноўскага, і Тадэвуша Касцюшку, і многіх іншых. Яны належаць не толькі нашай гісторыі. І з улікам таго, што наша гісторыя вельмі складаная, ім даводзілася жыць у розных мясцінах, нават у розных дзяржавах, і яны належаць нашай агульнай спадчыне, належаць спадчыне суседніх народаў. Не трэба дзяліць і прысвойваць і Станіслава Манюшку, і Адама Міцкевіча, і таго ж самага Кастуся Каліноўскага камусьці аднаму, якойсьці адной дзяржаве. Яны нашы, агульныя», — сказаў Уладзімір Макей.

На яго думку, агульная спадчына з'яўляецца мовай міжнацыянальных стасункаў, даступнай і зразумелай усім, падмуркам для міжкультурнага дыялогу, эфектыўным інструментам для развіцця стратэгічных добрасуседскіх адносін на будучыню.

Станіслаў Манюшка нарадзіўся, вучыўся і зрабіў першыя крокі ў музыцы ў Беларусі, першыя буйныя творы падрыхтаваў на тэрыторыі сучаснай Літвы, росквіт творчасці кампазітара звязаны з Польшчай. **Часовы павераны ў справах Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Марцін ВАЙЦЭХОЎСКІ** адзначыў: сёлета ў нашых краінах адбылося некалькі соцень мерапрыемстваў, прысвечаных Станіславу Манюшку. «Дазвольце падзякаваць за тое, што мы ўмеем дзяліцца Манюшкам у найлепшым разуменні гэтага слова. І кожная з нашых дзяржаў лічыць яго ў пэўнай ступені сваім. Гэта не ўсім падабаецца, але ўлічваючы біяграфію кампазітара, у нас няма іншага выбару», — падкрэсліў прадстаўнік польскай дыпламатыі.

Арганізатарамі мерапрыемства разам з МЗС Беларусі выступіў Нацыянальны гістарычны музей, які падрыхтаваў выстаўку «Станіслаў Манюшка: «Падарожжа ў XIX стагоддзе». Яе адкрыццё і прэзентацыя віртуальнага праекта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Станіслаў Манюшка. Музыкальны рамантык з Міншчыны» адбылося падчас цырымоніі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Добрыя жарты» плюс Іван Кірчук

**Мастацкі каляндар «Добрыя жарты» выпусціла да Новага года Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў. У яго распрацоўцы ўзялі ўдзел наведвальнікі Мінскага клубнага дома «Адкрытая душа» — цэнтра рэабілітацыі для людзей з псіхічнымі захворваннямі. Прэзентацыя выдання адбылася ўчора ў сталічным Палацы мастацтва. Перад гасцямі выступіў Іван Кірчук (этна-група «Троіца») з аўтарскім моноспектаклем «Дарожка мая».**

Для таго каб падрыхтаваць гэты каляндар, спецыялісты Мінскага клубнага дома «Адкрытая душа» разам з наведвальнікамі цэнтра прачыталі каля 8000 беларускіх прыказак (а гэта двухтомнік «Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах пад рэдакцыяй А. С. Фядосіка»), з якіх адабралі найбольш падыходзячыя. А пасля іх праілюстравала беларуская мастачка Таццяна Быц, спалучыўшы аўтэнтычнасць, народныя традыцыі і авангард.

— Першапачаткова мы задумвалі каляндар, які дапаможа людзям падняць настрой. І стараліся выбіраць прыказкі, якія ўтрымліваюць жарт, таму і назвалі праект «Добрыя жарты». Кампанія А1 адразу пагадзілася нас у гэтым падтрымаць, — расказвае **прадстаўніца Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў Кацярына ГУЗОЎСКАЯ-ГАРА.**

Ідэя праекта — у вяртанні да народных традыцый і мудрасці, якія фарміраваліся на працягу стагоддзяў.

— Часта праблемы сучаснага чалавека, у тым ліку і з псіхічным здароўем, звязаны з адмовай ад сваіх каранёў, традыцый, якія нас трымаюць. Гэтак жа як дрэва без каранёў не дае пладоў і высыхае, так і чалавек без свайго мінулага страчвае сябе. «Добрыя жарты» — гэта тое, што можа даць сілу. Пакуль мы абралі прыказкі, магчыма, у будучым звернемся да больш глыбокага вывучэння народнай культуры, — тлумачыць Кацярына Гузоўская-Гара.

Перакідны каляндар выйшаў абмежаваным тыражом у 1000 экзэмпляраў і будзе распаўсюджвацца бясплатна. Яго мэта — расказаць у тым ліку і пра клубны дом «Адкрытая душа», дзе ёсць магчымасць знайсці сяброў, вярнуць упэўненасць у сваіх сілах і атрымаць падтрымку.

— Мы жывём у грамадстве, дзе шмат стэрэатыпаў па тэме псіхічнага здароўя. Чалавек, які трапляе ў бальніцу, ведае толькі тое, што шызафрэнія — гэта вельмі дрэнна і безнадзейна, вылечыць яе амаль немагчыма, і хутчэй за ўсё ад цябе адвернуцца сябры і ты страціш работу. Чалавек адразу малюе сабе сітуацыю, дзе ён застанецца адзін. Ён баіцца падзяліцца сваёй праблемай, проста закрываецца ў сабе. У выніку адчувае сябе нікому не патрэбным і ні на што не вартым. Мы ж імкнёмся дапамагчы яму не быць у ізаляцыі. Самае галоўнае ў рэабілітацыі — каб чалавек не быў сам-насам са сваёй хваробай.

Клубны дом «Адкрытая душа» працуе ў Мінску з 2011 года. Сёння ён аб'ядноўвае 175 членаў. Гэта людзі з расстройствамі псіхічнага здароўя, якія маюць патрэбу ў рэабілітацыі. Сацыяльныя работнікі і валанцёры клубнага дома падтрымліваюць любыя ідэі сваіх падапечных і праводзяць заняткі па арт-тэрапіі, акцёрскім майстэрстве, псіхалагічныя трэнінгі, камп'ютарныя курсы, пры магчымасці ўладкоўваюць на работу. У прыватнасці, арганізацыя супрацоўнічае са Свята-Елісавецінскім манастыром, які дае рабочыя месцы для такіх людзей.

— Наша задача — псіхалагічна падтрымаць чалавека, даць яму зразумець, што хвароба — гэта не паражэнне, а сітуацыя, у якой важна зразумець, як дзейнічаць. Адна дзяўчына прыйшла да нас пасля некалькіх месяцаў, праведзеных у закрытым стацыянары РНПЦ псіхічнага здароўя. Яна была цалкам расчараваная ў жыцці, практычна не размаўляла, прымала вялікую колькасць моцных прэпаратаў з пабочным дзеяннем. Ёй было цяжка нават падняцца з ложка раніцай, і гэта вялікі подзвіг, што дзяўчына прыходзіла ў клубны дом. У рэшце рэшт яна сама напісала сцэнарый да нашага спектакля «Казка пра аднавухага зайца», зрабіла загатоўкі лялек, ездзіла разам з намі на ўсе выступленні. Пасля выйшла з клубнага дома і цяпер паспяхова займаецца спектаклямі ўжо з іншай арганізацыяй. Такія прыклады вельмі натхняюць, — рэзюмуе Кацярына Гузоўская-Гара.

**Алена КРАВЕЦ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЯК «УЕДЗЕМ» У СВЯТЫ?

**Якім чынам зменіцца падчас іх графік работы грамадскага транспарту ў Мінску, паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс».**

Змяненні закрануць маршруты гарадскога і прыгараднага транспарту, гэта варта ўлічваць пасажырам, каб загадзя планаваць свае паездкі.

Графік работы грамадскага транспарту зменіцца ў выхадныя і святочныя дні ў канцы снежня і пачатку студзеня. У прыватнасці, 21, 25 і 28 снежня аўтобусы № 13 і № 35 будуць хадзіць па графіку буднага дня. У тыя ж дні на аўтобусным маршруце № 921 паменшаць колькасць рухомага саставу.

Акрамя таго, 24 і 30 снежня ўсе прыгарадныя аўтобусы будуць курсіраваць па раскладзе аўторка. А 31 снежня і 1 студзеня некаторыя прыгарадныя аўтобусы і зусім не будуць хадзіць, паколькі ў гэтыя дні, па даных «Мінсктранса», істотна знізіцца пасажырапаток. З 1 да 7 студзеня работа прыгараднага транспарту будзе арганізавана па графіку нядзельных дзён.

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ «ЧАСНАЧЫНКІ»

**У 10-гадовага жыхара Бярозы канфіскаваны петарды**

**У адной са школ райцэнтра чацвёртакласнікі на перапынку абступілі свайго аднагодка і нешта з цікавасцю разглядалі. Такі ажыятаж прыцягнуў увагу настаўніка. Жанчына падышла бліжэй, убачыла ў руках хлопчыка каробку з петардамі і неадкладна выклікала міліцыю.**

Работнік інспекцыі па справах непаўналетніх Бярозаўскага РАУС, які прыбыў на месца, канфіскаваў піратэхніку — 75 штук так званых «часначынак»: міні-петардаў памерам з канцылярскую кнопку. Для выбуху іх не трэба падпальваць, дастаткова кінуць на зямлю або ў сцяну. Прадаюцца яны ў каробцы па 50 штук за паўтара рубля.

Як растлумачыў хлопчык, кожны дзень ён браў у мамы тыя самыя паўтара рубля, нібыта на малочныя кактэйлі, а сам купляў петарды. У той дзень у яго было дзве каробкі піратэхнічных вырабаў. 25 штук ён паспеў выкарыстаць.

Праваахоўнікі дадуць ацэнку ўдзелу бацькоў у выхаванні дзіцяці, а таксама дзеянням прадаўца. Як нагадалі ў МУС, рэалізацыя такой прадукцыі забаронена асобам да 15 гадоў.

## КАМЯНЯМІ — У ПРЫВАТНЫЯ ДАМЫ

**У горадзе Свіслач малады чалавек 1990 года нараджэння камянямі кідаў у бок дамоў мясцовых жыхарак.**

Па інфармацыі УУС Гродзенскага аблвыканкама, у пенсіянеркі 1950 года нараджэння аказалася пабітым шкло, а жанчыне 1974 года нараджэння з суседняй вуліцы фігурант гісторыі пашкодзіў драўляную абрашотку жылля.

Паведамленне аб тым, што невядомы кідае камяні ў дамы, паступіла ў дзяжурную частку мясцовага райаддзела міліцыі. Па «гарачых слядах» праваахоўнікі затрымалі маладога чалавека. Па выніках агляду ён аказаўся нецвярозы, і пры стасунках з праваахоўнікамі прычыну сваіх агрэсіўных паводзін назваць не змог. Проста вяртаўся з крамы, дзе набыў цыгарэты...

Вядома, што раней хлопец неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Цікавы досвед

# ЧАМУ ТАК ВАЖНА ДУМАЦЬ НАД ГІСТОРЫЯЙ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ

## Герагог з Германіі расказала аб новых формах работы з пажылымі

**Сафі ФОЕТС-ХАНЭ з нямецкага горада Дзюсельдорфа працуе з пажылымі людзьмі ў якасці культур-герагога і распрацоўвае розныя праекты на тэму «Культура і ўзрост». Яна расказала пра сваю работу ў Мінску ў рамках форуму «Годнае даўгалецце».**

Паняцце «герагогіка» прыйшло з грэчаскай мовы. Яно складаецца з двух слоў: «Geraios / Geraros» у значэнні «стары», і «Ago», якое азначае «я вяду да..., я суправаджаю, я паказваю шлях». Гэта новы кірунак, які вывучае магчымасці культурнай адукацыі і ўдзелу пажылых людзей у грамадскіх працэсах.

Культура- і мастацтва-арыентаваная герагогіка — гэта зусім маладая дысцыпліна. Першыя курсы з'явіліся толькі ў 2010 годзе. Герагогіка з апорай на мастацтва і культуру натхняе людзей і адкрывае перад імі новыя магчымасці. Цэнтральнае поле яе дзеяння — работа над біяграфіяй.

### Аб казытанні сена ён успамінае і сёння...

— «Народ, які не памятае сваёй гісторыі, асуджаны на яе паўтарэнне». Гэта сказаў гісторык Джордж Сантаяна. На мой погляд, гэтае выказванне датычыцца не толькі народаў або груп людзей, але і кожнага чалавека, — лічыць Сафі Фоетс-Ханэ. — І гэтая цытата падводзіць нас да разумення сутнасці работы па захаванні памяці, а менавіта, усведамлення: усё, што здарылася ў мінулым — што адбывалася з нашымі бацькамі і нашымі дзядамі і бабулямі — датычыцца нас і сёння. А тое, што мы робім сёння, будзе датычыцца нашых дзяцей і ўнукаў. Такім чынам, работа над памяццю заўсёды датычыцца і будучыні.

**Сафі Фоетс-Ханэ цытуе пісьменніка Джозэфа Конрада, які сказаў: «Я ўспамінаю пра юнацтва і пра пачуццё, якое ніколі не вернецца, — пачуццё, што маё жыццё можа доўжыцца вечна, даўжэй чым мора, зямля і ўсе людзі».**

— З людзьмі ў высокім узросце (бліжэй да 80 — 90+) я абмяркоўваю часам пытанне, ці могуць яны яшчэ ўспомніць сітуацыю, у якой даведаліся, што Другая сусветная вайна скончылася. Чым яны займаліся ў той момант і што адчулі? Большасць людзей вельмі добра памятаюць гэты момант. Адзін з удзельнікаў расказаў, што з Дзюсельдорфа яго эвакуіравалі ў сельскую мясцовасць, каб выратаваць ад бамбардзіровак, і ён жыў у аднаго селяніна. Яму было ўсяго пяць гадоў, але ён адразу зразумеў, што гэта вельмі важная і радасная вестка. У гэты час ён быў у хляве і ад радасці скокнуў на сена. Аб казытанні сена ён успамінае і да сёння...

Адна жанчына, якая нарадзілася ў 1928 годзе, сёння ёй ужо 91 год і яна ўсё яшчэ ўдзельнічае ў маіх біяграфічных семінарах, прыгадала, як у красавіку 1945 года амерыканцы заехалі на танках на вуліцы Дзюсельдорфа. Гэтая вестка вокамгненна разнеслася па горадзе. Ёй тады было 17 гадоў, яна вельмі хутка пашыла сабе са старых гардзін сукенку і пабегла ў цэнтр горада, каб прысутнічаць на гэтай падзеі. Нягледзячы на тое, што яе маці, якая хоць і была заўзятай прыхільніцай Гітлера, катэгарычна забараніла ёй гэта. «Мілая, там негры, табе туды нельга». Але ў гэты момант для яе ўжо пачалася будучыня. Сённяшнія 70—90-гадовыя ўсё яшчэ глыбока адчуваюць жахі вайны. Гэты страх або гэтую траўму яны перадалі сваім дзецям, часам без слоў. (Пагадзіцеся, што такія ўспаміны і перажыванні вельмі блізкія і зразумелыя і для пажылых беларусаў, хоць у той вайне мы былі па розныя бакі барыкад. — **Аўт.**)

Сафі Фоетс-Ханэ расказала аб яшчэ адным цудоўным праекце, які некалькі гадоў таму быў рэалізаваны на базе Цэнтра па вывучэнні праблем старасці Кёльнскага ўніверсітэта. Навуковая супрацоўніца гэтага цэнтра, якая на той момант толькі што пайшла на пенсію, ініцыявала праект «Унукі-Дзядулі / Бабулі». Унукі атрымалі невялікія рэкамендацыі, кіруючыся якімі, яны павінны былі даследаваць пакоі сваіх дзядуляў / бабуль. Пры гэтым усплылі захапляльныя артэфакты і гісторыі, на аснове якіх пасля была арганізавана выстаўка. Бацькі (то-бок, дзеці дзядуляў / бабуль) былі нямала здзіўленыя, таму што дзякуючы гэтаму яны даведаліся шмат новага пра сваіх бацькоў, а таксама і аб здольнасцях сваіх дзяцей...

### Дух Фрыды наведвае Райсхольц...

Яшчэ адзін праект, якім падзялілася нямецкі герагог, мае назву «Дух Фрыды наведвае Райсхольц».

— Райсхольц — гэта бедны гарадскі квартал у Дзюсельдорфе, — кажа Сафі Фоетс-Ханэ. — Там жыве шмат мігрантаў і бедных людзей. Здавалася б, наўрад ці людзі, што жывуць там, цікавяцца мастацтвам. Але гэта не так, прынамсі, калі гаворка ідзе пра Фрыду Кало. Мексіканская мастачка пакінула пасля сябе творы, якія кранаюць людзей ва ўсім свеце. Асаблівае месца ў яе творчасці займаюць аўтапартрэты. Штуршком для праекта стала тое, што вясной гэтага года ў нас быў выстаўлены арыгінал карціны Фрыды Кало. Гаворка ідзе пра знакамітую карціну «Аўтапартрэт на мяжы паміж Мексікай і Злучанымі Штатамі» 1932 года.

Мы вырашылі прывезці гэтую карціну ў Райсхольц і прымеркавалі падзею да міжнароднага жаночага дня. Потым арганізавалі семінар у Цэнтры для пажылых людзей. Справа ў тым, што гэты і іншыя яе аўтапартрэты вельмі актуальныя і сёння і суадносяцца з досведам многіх мігрантаў з усяго свету, якія знаходзяцца паміж культурамі. Многія жанчыны ідэнтыфікавалі сябе з мастачкай.

Неўзабаве, у жніўні, мы правялі другое мерапрыемства, прысвечанае Фрыдзе. Гэтым разам тэмай абмеркавання быў «Блакітны дом», Casa Azul, у якім Фрыда жыла разам са сваім мужам Дыега Рывера ў Мехіка-Сіці. Зараз мы думаем пра тое, каб працягнуць серыю, прысвечаную Фрыдзе Кало, якая ўжо стала вельмі папулярнай у Райсхольце, і ў наступным годзе.

**Сённяшнія 70—90-гадовыя ўсё яшчэ глыбока адчуваюць жахі вайны. Гэты страх або гэтую траўму яны перадалі сваім дзецям, часам без слоў.**

Цікава, што, па-першае, у рамках гэтага праекта пачалі сустракацца і расказваць пра сваё жыццё жанчыны, якія наўрад ці калі-небудзь сустрэліся б адна з адной — гэта і жанчыны сярэдняга саслоўя, якія цікавяцца мастацтвам, і жанчыны з Усходняй Еўропы (пераважна з Польшчы і Расіі), якія пераехалі ў Германію, і мігранты з паўночнаафрыканскіх і арабскіх краін. Па-другое, жанчыны цяпер зацікаўлены ў тым, каб яшчэ больш даведацца пра Фрыду.

* * *

Сафі Фоетс-Ханэ цытуе пісьменніка Джозэфа Конрада, які сказаў: «Я ўспамінаю пра юнацтва і пра пачуццё, якое ніколі не вернецца, — пачуццё, што маё жыццё можа доўжыцца вечна, даўжэй чым мора, зямля і ўсе людзі».

Нямецкі спецыяліст лічыць, што культура-герагогіка дапамагае натхняць людзей, якія ўступілі ў старэйшую ўзроставую групу, яшчэ раз прасякнуцца пачуццём, апісаным Конрадам, і паразважаць пра тое, што рухала імі, калі яны былі маладымі. Што стала з іх планамі? Ці змянілі падзеі XX стагоддзя іх мары? Як, падводзячы вынікі жыцця, яны могуць пражыць дадзены ім час?

— 1 верасня 1939 года немцы пачалі Другую сусветную вайну, напаўшы спачатку на Польшчу, — кажа Сафі Фоетс-Ханэ. — Тым, хто нарадзіўся ў той перыяд, ужо 80 гадоў. Сёння мы можам сказаць, што ўсе, хто нарадзіўся пасля гэтага ў Заходняй, Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, не важна, у якой сям'і — ахвяр ці злачынцаў, прама ці ўскосна адчуваюць на сабе наступствы гісторыі і фашызму. Як чалавек, які нарадзіўся пасля вайны, сёння я хацела б сказаць вам, абапіраючыся на сваю памяць: давайце ўсе разам, памятаючы пра мінулае і думаючы пра будучыню, рабіць усё, каб такое не паўтарылася.

**Святлана БУСЬКО.**

❍ У ТЭМУ

## СТАРЭННЕ Ў ГЕРМАНІІ

У Германіі многія людзі аж да сталага ўзросту хочуць актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства. Сваю станоўчую ролю тут адыгрываюць новыя магчымасці адукацыі, а таксама рост дабрабыту. Аднак пазітыўная карціна азмрочваецца некаторымі фактарамі. Гэта датычыцца ўзмацнення беднасці ў старасці, якое зноў стала назірацца ў апошнія гады. У 2014 годзе доля рызыкі трапіць у групу бедных сярод насельніцтва ва ўзросце 65 гадоў і вышэй складала 14,4 %, і такая тэндэнцыя ўзмацняецца.

У сельскай мясцовасці адзначаюцца інфраструктурныя праблемы, у гарадах — дарагавізна жылля. Пры гэтым у Германіі каля 1,7 млн. чалавек пакутуюць на дэменцыю. Штогод да гэтага ліку дадаецца больш за 300 000 новых выпадкаў. Сітуацыя ў галіне догляду за маючымі ў гэтым патрэбу крытычная — адчуваецца недахоп усяго, перш за ўсё, работнікаў па доглядзе за такімі людзьмі.

У той час як працягласць жыцця ўзрастае, колькасць нованароджаных скарачаецца. Калі ў пачатку XX стагоддзя доля насельніцтва ад 60 гадоў і вышэй складала 8 %, то да 2050 года гэтая лічба складзе прыкладна траціну насельніцтва. (Крыніца: Федэральны цэнтр палітычнай адукацыі Германіі.)

**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **частное предприятие «Вдалита»** (УНП 690691426) в лице антикризисного управляющего ИП Лужинского А. И.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 247-ЗБ/2017 в экономическом суде Минской области будут проведены: **9 января 2020 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

**Предмет торгов** – земельный участок с кадастровым номером 623883503101000002 площадью 0,0513 га, капитальное строение с кадастровым номером 630/С-54095 площадью 297,7 кв. м в д. Зоренька Молодечненского р-на, Минская обл. Начальная цена предмета торгов – 9 769,00 бел. руб. без НДС. Минимальная цена предмета торгов – 6 838,30 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698 53 18.

**Для участия в торгах необходимо** в срок по 8 января 2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее пяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Подробнее на beltorgi.by

**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: частное строительное унитарное предприятие «ГостСтрой» (УНП 590778694), 223034, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Советская, д.118, ком. 1/4, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридический момент», тел. +375 (29) 616-50-57.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **9 января 2019 г. в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение, инв. № 124/С-21348, здание административно-хозяйственное – административное здание, площадь 450,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22 | 37 046,22 |
| 2 | Капитальное строение, инв. № 124/С-21346, здание пристройки к заводоуправлению, площадь 298,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22 | 24 519,03 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 08.01.2020 г. до 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовало в газете «Звязда» от 31.10.2019 г.

**Извещение о проведении 30 декабря 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»**

| Предмет торгов |
|---|
| «Трансформаторная подстанция» общей площадью 42,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50676; «складское помещение» общей площадью 15,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50677; «производственно-бытовой корпус» общей площадью 118,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50678 (составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение, ворота, калитка, ворота); «устройство моечного отделения щебня» общей площадью 589,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-63932; асфальтосмесительная установка ДС-185 (инв. № 620); агрегат мокрой очистки щебня (инв. № 762); емкость 10 м³ (битум, инв. № 847); емкость 20 м³ (битум, инв. № 848); емкость 20 м³ (битум, инв. № 849); весы RV 3102 (инв. № 862); бункер приемный (инв. № 763); система видеонаблюдения (инв. № 0163); передвижное общежитие (инв. № 73); узел 1 подачи ж/с и щебня/конвейер 9 мп (инв. № 764); узел 2 подачи ж/с и щебня/конвейер 12 мп (инв. № 765); холодильник МИНСК 11 (инв. № 778);<br>зеленые насаждения: липа № 22 (инв. № 918); тополь №10 (инв. № 906); тополь №9 (инв. № 905); сосна № 14 (инв. № 910); сосна № 15 (инв. № 911); сосна № 17 (инв. № 913); береза № 1 (инв. № 897); береза № 11 (инв. № 907); береза № 12 (инв. № 908); береза № 13 (инв. № 909); береза № 16 (инв. 912); береза № 18 (инв. № 914); береза № 19 (инв. № 915); береза № 2 (инв. № 898); береза № 20 (инв. № 0916); береза № 21 (инв. № 917); береза № 3 (инв. № 899); береза № 4 (инв. № 0900); береза № 5 (инв. № 901); береза № 6 (инв. № 902); береза № 7 (инв. № 903); береза № 8 (инв. № 904) |
| Местонахождение: Витебская область, Витебский район, Новкинский с/с, д. Куковячино |
| Площадь земельного участка: 2,6274 га, кадастровый номер: 221287000010000001 |
| Начальная цена: 208 219,68 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 20 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ №7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, т. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, т. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 30 декабря 2019 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 19.12.2019 по 27.12.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

19 СНЕЖНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15877)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Крысціна КРЫСАНАВА:

# «Сваім 54-м памерам цалкам задаволеная!»

**90-60-90 — менавіта гэтыя параметры прынята лічыць ідэальнымі. Аднак свет не стаіць на месцы, і дзяўчаты, якія выходзяць за рамкі стандартаў, даказваюць, што можна быць паспяховымі і прыгожымі, нягледзячы на лішнюю вагу. Беларуска памеру «плюс» Крысціна КРЫСАНАВА расказала пра тое, чаго патрабуюць ад поўных мадэляў, якія праблемы ўзнікаюць пры выбары адзення з мас-маркета і наколькі такі мадэлінг развіты ў нас.**

***— Стаць мадэллю было мэтай ці гэта выйшла спантанна?***

— Я не вучылася ў Нацыянальнай школе прыгажосці, не праходзіла спецыяльных курсаў, мне проста падабалася фатаграфавацца. Кар'ера пачалася яшчэ ў Смалявічах, дзе жыла да пераезду ў Мінск. Неяк прапанавалі паўдзельнічаць у дэманстрацыі сукенак мясцовага вясельнага салона, вопыт вельмі спадабаўся, і пасля яго я вырашыла развівацца ў гэтай індустрыі. А ў 18 гадоў апынулася ў сталіцы.

***— Цяжка было знайсці работу ў Мінску?***

— Гэты тып мадэлінгу не вельмі развіты ў нашай краіне. Не ўсе брэнды могуць сабе дазволіць такі эксперымент. Але мне пашанцавала, вядомы партал арганізаваў для дзяўчат plus size конкурс «Sweet lady», і я ўзяла ў ім удзел. Ён стаў выдатным стартам для кар'еры. І менавіта пасля яго мяне заўважыў фатограф і запрасіў на здымкі для Volkswagen. Потым усё стала наладжвацца: розныя фотасесіі, паказы... Апошнім буйным праектам было супрацоўніцтва з «Мілавіцай».

***— Дарэчы, пра яго....***

— Тэма застаецца нашумелай нават цяпер. Усе прывыклі бачыць танюсенькіх мадэляў, асабліва калі гаворка ідзе пра рэкламу ніжняй бялізны. Але я лічу гэта не зусім правільным.

Часы мяняюцца, і дзяўчаты таксама. Яны хочуць бачыць, як рэч будзе выглядаць на іх, а не на ідэальных параметрах.

***— І ўсё ж: як вы сталі тварам гэтага брэнда?***

— Усё выйшла вельмі спантанна. У сацыяльных сетках мяне знайшла маркетолаг «Мілавіцы», папярэдне паглядзеўшы ў інтэрнэце мае работы, і паклікала да іх у офіс. Калі прыйшла, усе пільна аглядалі мяне, нават дырэктар, хоць пра гэта я ўжо даведалася пазней *(смяецца)*. Далі пару камплектаў бялізны, я прымерала, усім спадабалася, і мяне зацвердзілі. З гэтай фірмай я супрацоўнічаю ўжо трэці год, і мы нават ездзілі на фотасесіі ў Маскву і на Кіпр.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Не траціць у сетках

# ДЗЕ «ТУСЯЦЬ» СУЧАСНЫЯ ДЗЕЦІ

## Адны здымаюць, а іншыя — глядзяць і «лайкаюць»

**Уявіце сабе сітуацыю: матуля, сыходзячы на работу, цалуе ў макаўку сваю дачку-падлетка, а тая, як толькі за апошнім дарослым у доме зачыняюцца дзверы, нацягвае ласіны, уключае новы трэк, і, павярнуўшыся да камеры задам, рытмічна рухае целам. Ці танцуе топлес, прыкрываючы рукамі свае грудзі. Відэа ляціць у інтэрнэт, і праз некалькі хвілін з'яўляецца першы каментар сексуальна заклапочанага карыстальніка той жа сацыяльнай сеткі...**

### ІХ ТРЭБА ВЕДАЦЬ У «ТВАР»

**TikTok, Kwai, Likee...** Што дарослыя чулі пра гэтыя сацыяльныя сеткі?

— У TikTok вельмі папулярнае відэа, у якім дзяўчына без макіяжу ў піжаме правяла рукой перад камерай — і ў наступным кадры яна ўжо прыгожая, прыбраная, з прычоскай. Гэта адно з самых бяскрыўдных відэа, — расказвае **кансультант і каардынатар праекта па дзіцячай інтэрнэт-бяспецы GirlSafety, сузаснавальнік IT Princess Academy, педагог Валянціна ЧЭКАН.** — TikTok — новая папулярная сетка, якая дазваляе ствараць кароткія музычныя відэаролікі, весці прамыя эфіры і абменьвацца паведамленнямі. Пазіцыянуе сябе як канал для музычных талентаў. У канцы 2018 года ў ЗША гэты сэрвіс спампоўвалі часцей, чым Instagram, Facebook і YouTube. Як толькі ў нейкай сацыяльнай сетцы з'яўляецца крытычная колькасць дарослых, што робяць нашы дзеці? Яны масава бягуць туды, дзе іх ніхто не кантралюе, дзе можна рабіць усё — для іх гэта як глыток свабоды...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Свая справа

# НАТУРАЛЬНЫ МІНІМАЛІЗМ НА ДВАІХ

**Вікторыя і Антон ДВАРАВЕНКІ — маладая пара сужэнцаў-рамеснікаў з Гомеля, якія ствараюць мінімалістычныя скураныя аксесуары для жанчын і мужчын. Назва іх брэнда DELO RUK кажа сама за сябе: усе дэталі вырабаў выконваюцца ўручную.**

**Антон:** — Мы пачалі думаць пра ўласную справу, калі яшчэ былі студэнтамі. Тады я вучыўся ў Мінску, а Віка — у Ліверпулі. Пасля заканчэння зразумелі: працаваць на некага не хочам, значыць, трэба прыдумаць нешта сваё. Перабіралі розныя ідэі, параўноўвалі, у выніку прыйшлі да высновы, што нам па душы швейная вытворчасць. На пошук абсталявання і пастаўшчыкоў пайшло тры месяцы, пасля адразу пагрузіліся ў працэс. Цяпер у пералік нашых тавараў уваходзяць скураныя сумкі, кашалькі, картхолдары, рамяні, арганайзеры і ключніцы.

**Вікторыя:** — Са свайго бюджэту мы ўклалі ў бізнес пяць тысяч долараў — на абсталяванне і інструменты. Запусцілі брэнд у лістападзе 2017 года, і ўжо праз месяц выйшлі на самаакупнасць. Наша каманда пакуль што невялікая — мы з Антонам і капірайтар, які вядзе профіль у Instagram.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
19 12 2019 г.

# ДЗЕ «ТУСЯЦЬ» СУЧАСНЫЯ ДЗЕЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Жыццё сучасных дзяцей і падлеткаў распісана літаральна па хвілінах: школа, заняткі музыкай, замежнымі мовамі, басейн, гурткі. Усё спланавана дарослымі так, каб у малых не заставалася вольнага часу на розныя глупствы. Атрымліваецца, што дзіця псіхічна і фізічна амаль ніколі не бывае сам-насам з сабой. І многія ўцякаюць у сацыяльныя сеткі. Спачатку гэты былі Instagram і «УКантакце». А калі туды прыйшлі мамы і таты, з'явіліся новыя пляцоўкі — TikTok, Kwai і Likee. Там ніхто за табой не назірае і можна быць самім сабой: тапіць падручнікі ва ўнітазе, гарлапаніць розныя глупствы на ўсё горла, цалавацца па-даросламу, глытаць пену для галення...

TikTok, Likee і Kwai — вельмі падобныя сацыяльныя сеткі. Але гэта не тэрыторыя для стасункаў і філасофскіх пастоў. Kwai — сацсетка з мноствам фільтраў для рэдагавання відэа, магічнай анімацыяй, забаўнымі маскамі і агучкай. Як па ўзмаху чароўнай палачкі, можна прыбраць з твару падлетка вавыя вугры, стаць персанажам мемаў або апынуцца побач з вадаспадам. «Kwai створана, каб дзяліцца найлепшымі момантамі жыцця з сябрамі па ўсім свеце. Дай волю сваёй фантазіі і творчасці, раскажы пра свае захапленні ў кароткіх відэа. Пакажы сваю індывідуальнасць і знайдзі сяброў па інтарэсах. Будзь сабой, і тады ты зможаш сабраць шматтысячную аўдыторыю падпісчыкаў. З Kwai гэта лёгка!» — абяцаюць стваральнікі сацсеткі. Летась Kwai стала лідарам па запампоўцы ў Расіі.

**Першай рэакцыяй можа быць жаданне адабраць смартфон.**

Likee — таксама бясплатны відэарэдактар са спецэфектамі: дзеці і падлеткі там па-сапраўднаму змагаюцца за «лайкі». Дзеля гэтага яны малююць маркерам на твары, прымяраюць «цяжарныя жываты», цалуюцца і засоўваюць бабуліны зубныя пратэзы ў пластылін. Усё гэта ўперамешку з цалкам бяскрыўдным кантэнтам, дзе дзеці здымаюць скетчы ці проста танцуюць.

Фактычна ўсе тры сэрвісы прызначаны для стварэння кароткіх відэа і выкладвання іх у сеціва. Дзякуючы вельмі зразумеламу інтэрфейсу карыстальнікі могуць накласці фільтры або спецэфекты, сінхранізаваць рух вуснаў і слоў у песні. А разнастайнасць графічнага рэдактара дазваляе працаваць і з фатаграфіямі, і з відэаролікамі. Падлеткі проста дурэюць пад хітовую музыку: крыўляюцца, паўтараюць словы песень, прымяраюць на сябе «асобы» папулярных рэпераў, могуць загаварыць незвычайным голасам. Ролікі набіраюць па некалькі сотняў тысяч, а то і мільён праглядаў за пару дзён. Тут можна правесці некалькі гадзін, не разумеючы, чаму адны гэта здымаюць, а іншыя глядзяць і «лайкаюць».

## ІНСТРУМЕНТ ДЛЯ МАНІПУЛЯЦЫЙ

Любая папулярная сацсетка — гэта хітра наладжаная машына, якая прымушае карыстальніка зноў і зноў у яе вяртацца. Асабліва маладых, якія мацней зацікаўлены ў віртуальным поспеху і лягчэй вядуцца на рознага кшталту правакацыі. Для карыстальнікаў гэтых сетак галоўнае — атрымаць тону «лайкаў» і праглядаў. Псіхолагі тлумачаць: «лайк» у сацсетцы — гэта пагладжванне, дзеянне, якое сігналізуе пра тое, што нас бачаць, прызнаюць як асобу. «Лайк» эквівалентны ўсмешцы, кампліменту, актыўнаму слуханню, добраму слову. Няўпэўненым у сабе падлеткам, якія, як ніхто іншы, маюць патрэбу ў сацыяльным адабрэнні, асабліва важныя гэтыя «пагладжванні».

Дык наколькі бяскрыўдныя забаўляльныя Likee, TikTok і Kwai?

— Ва ўсіх іх, у адрозненне ад сацсетак для дарослых, вельмі слабая мадэрацыя, — папярэджвае Валянціна Чэкан. — І тое, што забаронена ў Facebook і Instagram, там дазволена. Напрыклад, прысутнічае шмат сексуалізаванага кантэнту: дзяўчаты прымаюць спакуслівыя позы, кусаюць вусны, круцяць клубамі, дэманструюць вышэйшы пілатаж стрып-пластыкі, танцуюць паўадзетыя, у кароткіх шортах ці ў ніжняй бялізне. Зусім нядаўна вельмі папулярныя былі відэаролікі з тверкам. Асацыяцыі са стрыптызам выканаўцаў не бянтэжаць, бо так будзе больш гледачоў, а значыць, больш падпісчыкаў і «лайкаў».

Фактычна дзеці бачаць вельмі шмат таго, што яны не павінны ў прынцыпе бачыць. Мы часта кажам дзяўчатам, што іх любяць за прыгажосць, што гэта вельмі каштоўны рэсурс, якім можна ў жыцці карыстацца і маніпуляваць іншымі людзьмі. Ці, наадварот, падлеткі не чуюць ад бацькоў нічога ўхвальнага наконт сваёй знешнасці, а ў іх узросце самаацэнка і без таго не вельмі высокая. І дзяўчаты пачынаюць шукаць пацвярджэнне сваёй знешняй прыцягальнасці ў чужых людзей, у сацыяльных сетках. Вось толькі рэакцыю яны могуць атрымаць зусім не тую, якую чакалі.

У каментарыях «падагрэтая» публіка можа настойліва прапаноўваць пазнаёміцца бліжэй. У гэтых сетках прысутнічае і шмат дарослых, якія зайшлі туды менавіта дзеля тых самых танцаў. Дзеці навучыліся агаляцца дзеля «лайкаў», а за імі тым часам мэтанакіравана назіраюць незнаёмцы. Як правіла, зламыснікі рэгіструюць акаўнт на імя школьніка і ад яго імені нібыта спрабуюць пасябраваць з ахвярай. Пасля нейкага перыяду стасункаў новы сябар просіць даслаць фотаздымкі без адзення. **Likee, TikTok і Kwai — сапраўдная знаходка для педафілаў.** Толькі ў гэтых сацыяльных сетках сканцэнтраваная велізарная колькасць дзяцей, якія гатовыя на многія рэчы дзеля «лайкаў» і новых падпісчыкаў.

Таксама там **прысутнічае вельмі шмат ненарматыўнай, вульгарнай лексікі:** і ў песнях, і ў каментарыях. Карыстальнікі могуць пераказваць мацерныя анекдоты. Пець пра гвалт і наркотыкі, падпяваючы адыёзным рэперам. Гэтыя мацюкальныя трэкі даступныя любому.

У Kwai можна знайсці ролікі, якія шакіруюць сваім зместам нават дарослых. Там **арганізуюцца небяспечныя чэленджы,** удзельнікі якіх перад камерай наносяць сабе парэзы нажом па горле або запясці, скачуць з дахаў, вісяць на падаконніках.

— Нядаўна гуляла прапанова: «З'еш перад камерай капсулу «Тайда» і пакажы, які ты круты». Яе вірусная папулярнасць скончылася масавымі атручэннямі падлеткаў, — расказвае Валянціна Чэкан. — Год таму прапаноўвалі зрабіць сэлфі на даху. І такія небяспечныя флэшмобы запускаюцца з зайздроснай перыядычнасцю. Увогуле існуе вельмі шмат ідыёцкіх спосабаў сабраць «лайкі». Абсалютная большасць карыстальнікаў паўтараць не будуць, проста паглядзяць, але гэта ўсё роўна жудасны кантэнт, які нацэлены на абясцэньванне жыцця. Дзецьмі маніпулююць: «А табе слабо?» Акрамя таго, там прысутнічаюць тысячы ролікаў у падтрымку паводзін, якія прыводзяць да анарэксіі.

Яшчэ адна небяспека — **раскрыццё асабістых звестак.** Падчас аднаго з чэленджаў прапаноўвалася зняць відэа са сваім пашпартам. «Бачыце, які я быў страшны, калі фатаграфаваўся на дакумент, а цяпер круты: у мяне ружовыя ці фіялетавыя валасы, клёвая прычоска, пірсінг...» І нават калі падлеткі закрывалі рукой асабістыя звесткі на старонцы ў пашпарце, яны забываліся, што ўся інфармацыя дублюецца ў стужцы знізу...

## НЕ ЗАБАРАНІЦЬ, А ПРАДУХІЛІЦЬ

— У IT Princess Academy ёсць групы для сямі-васьмігадовых дзяўчат. Мы шмат часу на сваіх занятках прысвячаем «азам» бяспечных паводзін у інтэрнэце, — працягвае спікер. — І вось аднойчы прыходзіць бацька адной з нашых выхаванак з прэтэнзіяй. Высвятляецца, што ён знайшоў у смартфоне дачкі сэрвіс TikTok, пазнаёміўся бліжэй з яго кантэнтам і быў шакіраваны. Кажа, што мы ў акадэміі недапрацоўваем. Пачынаем разбірацца, як гэтая праграма з'явілася ў тэлефоне. Кажа, што сам устанавіў, бо дачка яго вельмі прасіла. У такім разе, дарагія бацькі, вы самі несяце адказнасць. Падлеткі самастойна спампуюць гэтыя сэрвісы, але вось малыя без дапамогі дарослых не могуць абысціся. Калі вы на іх тэлефон устанаўліваеце праграму «Бацькоўскі кантроль» або наладжваеце Google play так, каб ён ведаў, колькі гадоў яго ўладальніку, то сын ці дачка не зможа самастойна ўстанавіць гэтыя сацыяльныя сеткі: там дзейнічаюць абмежаванні па ўзросце.

Калі вы праверыце смартфон свайго дзіцяці, то з высокай доляй імавернасці знойдзеце ў ім лагатыпы Likee, TikTok і Kwai. Але перад гэтым спытайце сябе: ці гатовыя ўбачыць нешта, што цалкам можа перавярнуць ваша ўяўленне пра сына або дачку? Першай рэакцыяй можа быць жаданне адабраць у дзіцяці смартфон, адключыць інтэрнэт і абмежаваць яго перамяшчэнні па-за кватэрай. Але вы насамрэч верыце, што можна засцерагчы, проста забараніўшы ўсё запар? Лепш распытайце дзіця, чым яго зацікавіў і захапіў канкрэтны відэасэрвіс.

**«Лайк» у сацсетцы — гэта пагладжванне, дзеянне, якое сігналізуе пра тое, што нас бачаць.**

— Калі вы выявілі ва ўстаноўленай праграме не прымальны для дзяцей кантэнт — парнаграфію, ролікі з членашкодніцтвам або заклікамі да самагубства, — спакойна растлумачце небяспеку і разам выдаліце праграму са смартфона, — раіць Валянціна Чэкан. — Бацькам трэба зразумець, што дзіця цягнецца за віртуальным поспехам не проста так. Калі яму чагосьці не хапае ў рэальным жыцці, яно будзе спрабаваць кампенсаваць гэта «лайкамі». Калі падлетак займаецца членашкодніцтвам, ён сябе за штосьці карае, магчыма, неабходна звярнуцца па дапамогу да псіхолага.

Трэба тлумачыць, што калі ў сваіх відэа дзіця паказвае сапраўднае імя, месца жыхарства і іншыя асабістыя звесткі, якія дазваляюць знайсці яго ў рэальнасці, яно можа прыцягнуць увагу псіхічна хворых людзей або зламыснікаў. Што аднойчы раздзеўшыся перад камерай і прачытаўшы потым каментарыі пра сябе, можна атрымаць вельмі моцны ўдар па псіхіцы. Перамагчы комплексы атрымліваецца далёка не ўсім, таму такія паводзіны могуць мець сур'ёзныя наступствы ў будучым асабістым жыцці.

Калі ў дачкі ці сына ўжо стаяць гэтыя сэрвісы, папрасіце праверыць, ці з'яўляецца акаўнт прыватным. Каб ролікі маглі каментаваць не ўсе сем мільярдаў людзей на планеце, а толькі тыя, каго яны самі дадалі ў сябры. І **каб ніхто не мог спампаваць іх асабістыя відэаматэрыялы. Трэба навучыць клапаціцца пра сябе.** Мы ж не пускаем да сябе у дом людзей у брудным абутку...

Наўрад ці дачка прызнаецца бацькам, што яна выклала ў сеціва свае сексуальныя фатаграфіі. Але калі звярнулася да вас па дапамогу, высвятляйце, дзе яна паспела гэта зрабіць. Канчаткова з інтэрнэту нічога выдаліць немагчыма, але калі здымкі выкарыстоўваліся разам з асабістымі звесткамі, трэба звяртацца ў праваахоўныя органы, бо самі вы гэту сітуацыю не разруліце.

Калі дзіця паскардзілася на пагрозы ад незнаёмцаў, зрабіце скрыншоты такіх паведамленняў (праваахоўным органам яны спатрэбяцца), не ўступайце ў перапіску з агрэсарам. Булінг у інтэрнэце можа набываць касмічныя маштабы. Калі працэнт агрэсіі зашкальвае, лепш увогуле выдаліць акаўнт. А калі пагрозы цалкам канкрэтныя, варта суправаджаць дзіця, сустракаць яго са школы, змяніць звычайны маршрут. Дарэчы, даследаванні паказваюць, што ў 78 працэнтах выпадкаў дзеці ведаюць, хто ім пагражае.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Гэта — мы

# Актыўная пазіцыя — праз сацрэкламу

**Стартаваў рэспубліканскі конкурс сацыяльнай рэкламы «Маладзёжны погляд».
Яго арганізатарамі выступаюць Міністэрства адукацыі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Мэта конкурсу — фарміраванне ў юнакоў і дзяўчат актыўнай жыццёвай пазіцыі, стымуляванне творчасці праз стварэнне друкаванай сацыяльнай рэкламы, сацыяльных відэаролікаў і матыватараў, якія сцвярджаюць агульначалавечыя каштоўнасці.**

Згодна з умовамі, у конкурсе могуць удзельнічаць маладыя людзі (як асобныя аўтары, так і калектывы) ва ўзросце ад 14 да 31 года. Для гэтага неабходна падрыхтаваць рэкламны матэрыял сацыяльнага характару па адной або некалькіх намінацыях і тэмах, якія адпавядаюць мэтам і задачам творчага спаборніцтва.

Конкурс праводзіцца ў трох намінацыях: друкаваная сацыяльная рэклама (афіша, буклет, білборд, расцяжка, улётка, інфармацыйны лісток, рэкламны лісток, наклейка, плакат, прэс-рэліз, праспект, банер), сацыяльны відэаролік і сацыяльны матыватар.

Для стварэння сацыяльнай рэкламы прапануюцца наступныя тэмы: «Беларусь паспяховая», «Мы беларусы», «Мы гаворым — не», «Мая сям'я — маё багацце», «Дарогай добрых спраў», «Жыві ярка!», «Наша культура», «Беражы прыроду», «Бяспека жыцця», «У адзінстве наша сіла». Больш падрабязна з умовамі конкурсу можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Міністэрства адукацыі ў раздзеле «Агульная інфармацыя / Маладзёжная палітыка / Конкурс. Палажэнні».

Заяўкі і конкурсныя работы прымаюцца да 20 студзеня 2020 года ў электронным выглядзе на e-mail uvrm.bsuir@gmail.com з пазнакай «Рэспубліканскі конкурс сацыяльнай рэкламы «Маладзёжны погляд».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Тэорыя поспеху

# «ЗАРАЗІЦЦА» НАВУКАЙ,

## або Якія распрацоўкі маладых вучоных хутка з'явяцца ў нашым жыцці?

**Авіякасмічныя, аграпрамысловыя тэхналогіі, бія- і нанаіндустрыя, медыцына, фармацыя і медыцынская тэхніка, рацыянальнае прыродакарыстанне... Гэта і многае іншае прадставілі маладыя вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук у сталіцы падчас конкурснага адбору для ўдзелу ў фінальным этапе праекта «100 ідэй для Беларусі». З інавацыямі выступіла больш за 40 маладых навукоўцаў.**

**Прадстаўнік Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Аксана ЦІМОХІНА** *(на фота)* разам з калегамі прапануе альтэрнатыўнае лячэнне пры анкалагічных захворваннях пры дапамозе аўталагічных дэндрыдных клетак, што выконваюць важную імунарэгулятарную функцыю ў арганізме.

— Стандартная схема лячэння раку, якая прапаноўваецца ў медыцынскіх установах, не заўсёды дае станоўчы вынік, таму мы як навукоўцы шукаем новыя метады. Сутнасць прадстаўленай тэрапіі наступная: спачатку ідзе падрыхтоўка, якая доўжыцца сем дзён, потым выдзяляем патрэбныя нам клеткі хворага чалавека і «знаёмім» іх з генам пухліны, а потым уводзім іх назад. Пасля гэтага яны ўжо «ведаюць» канкрэтную мэту ўздзеяння на арганізм. Пакуль што выкарыстоўваем клеткі самога пацыента (аўталагічныя), але імкнёмся да таго, каб атрымліваць іх ад донараў (алагенныя). Таксама плануем стварыць для дэндрыдных клетак асобны банк, у якім яны будуць знаходзіцца ў стане замарозкі і імі можна будзе ў любы момант скарыстацца. На жаль, цяпер перыяд іх жыцця складае не больш за пяць гадзін, — расказала Аксана Цімохіна.

Яна дадала, што імунатэрапія, пры якой выкарыстоўваюцца аўталагічныя дэндрыдныя клеткі, — гэта не асноўны варыянт лячэння цяжкай хваробы. Аднак такая альтэрнатыва ўжо даказала сваю эфектыўнасць за мяжой і ў рамках клінічных выпрабаванняў на базе клетачнага цэнтра НАН. Яе пацыхова прайшлі 30 пацыентаў з рознымі відамі анкалогіі на розных стадыях развіцця захворвання, эфектыўнасць падцверджана паляпшэннем узроўню іх жыцця і яго падаўжэннем.

**Урач клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці Надзея СІТНІК** прэзентавала метад генетычнага прагназавання развіцця некаторых ускладненняў у неданошаных нованароджаных. Праект рэалізуецца сумесна з супрацоўнікамі Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН.

— Мы хочам выкарыстоўваць панэль генаў для вызначэння схільнасці неданошанага дзіцяці да дыхальных захворванняў. Некаторыя з іх пакідаюць цяжкія наступствы на ўсё жыццё. Каб звесці рызыку да мінімуму, трэба распачынаць прафілактыку або лячэнне з першых дзён нараджэння. На гэты момант пры аналізе геннага матэрыялу ў медыцынскіх установах разглядаецца адразу шмат генаў, прыкладна да пяці тысяч. Таму на яго расшыфроўку сыходзіць шмат часу і грошай (поўны аналіз на сёння каштуе больш за 600 долараў). Мы ж хочам вылучыць менавіта адзінкавыя гены, якія адказваюць толькі за схільнасць да дыхальных захворванняў у малых. Гэта зробіць працэдуру хуткай і даступнай для ўсіх. А далей на падставе даных панэлі можна будзе распачаць лячэнне, — расказала Надзея Сітнік.

Укараненне метаду генетычнага прагназавання развіцця захворванняў у нованароджаных у медыцынскую практыку разлічана на два гады. Вучоныя Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН і ўрачы клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці плануюць супрацоўнічаць з клінічнымі радзільнымі дамамі абласных цэнтраў краіны, каб атрымаць станоўчы вынік дыягностыкі і лячэння па гэтай праблеме.

З фармакалагічнай сферай звязаны праект, які прадставіла **малады вучоны Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Ксенія БАРАДЗІНА** *(на фота)*. Ён прысвечаны распрацоўцы новых пептыдных нейрапратэктараў, якія валодаюць супрацьтрывожным і антыдэпрэсіўным уздзеяннем.

Калі простай мовай, то пептыды — гэта біялагічна актыўныя злучэнні, якія выпрацоўваюцца рознымі клеткамі і забяспечваюць сувязь паміж асноўнымі рэгулятарнымі сістэмамі арганізма. Нейрапратэктары — лекавыя прэпараты, дзеянне якіх скіравана на абарону нервовых клетак ад патагенных фактараў.

— Дэпрэсія і трывожнасць — вельмі распаўсюджаныя захворванні. Калі іх не лячыць, яны могуць паўплываць на іншыя сістэмы арганізма. На жаль, многія існуючыя на рынку прэпараты валодаюць вялікай колькасцю пабочных эфектаў. Наша распрацоўка добра паказала сябе ўжо на стадыі даклінічных выпрабаванняў. Рэчыва было атрымана з амінакіслот, якія ёсць у арганізме чалавека. Гэта аналаг прыродных гармонаў, ён падыходзіць і для дзяцей, напрыклад, калі ёсць праблема гіперактыўнасці. На аснове пептыдных нейрапратэктараў мы стварылі прэпарат у выглядзе спрэю для носа, такі варыянт лекаў не вельмі паўплывае на печань і страўнік, — падзялілася Ксенія Барадзіна.

Дарэчы, перавагі прэпаратаў на аснове пептыдаў даволі значныя: гэта і нізкае іх назапашванне ў тканках, і шырокі спектр мэт, меншая таксічнасць у параўнанні з іншымі прэпаратамі, адсутнасць залежнасці ад іх, эфектыўнае дзеянне пры нізкіх канцэнтрацыях. Ксенія ўпэўнена, што айчыннае адкрыццё можа быць рэалізаванае праз пяцьсем гадоў і стане добрай альтэрнатывай тым прэпаратам, якія ўжо ёсць на рынку.

Развіццё аграпрамысловага комплексу краіны цікавіць **вядучага навуковага супрацоўніка аддзела паразіталогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі Наталлю ШЧАМЯЛЁВУ** *(на фота злева)*. Яна прэзентавала лекавы прэпарат супраць паразітарных хвароб авечак.

— На 2019—2025 гады ў краіне прынята праграма па развіцці авечкагадоўлі. На сёння ў гаспадарках налічваецца прыкладна 88 тысяч гэтых жывёл. Яны даюць добрае патомства, але часта заражаюцца паразітамі, што прыводзіць да страты апетыту, рэзкага пахудзення, адставання ў развіцці або ўвогуле да гібелі. Прэпарат, які мы распрацавалі для вырашэння гэтай праблемы, нетаксічны і бясшкодны. Нават дзесяціразовая доза не выклікае сур'ёзных наступстваў у жывёл. Таксама ён недарагі, — цана складае прыкладна 70 капеек за адзін прыём. Яшчэ прэпарат замяняе адразу некалькі лекаў і складаецца з чатырох экалагічных кампанентаў. Адзін з галоўных напаўняльнікаў — лактоза. Такое салодкае рэчыва авечкі добра ядуць, таму лячыць іх будзе нескладана. Поўнае выздараўленне адбываецца ўжо на сёмы дзень пасля пачатку прыёму лекаў, — запэўніла Наталля Шчамялёва.

Распрацаваны прэпарат будзе выпускацца ў форме болюсаў, падобных на спрасаваныя таблеткі. У далейшым іх можна выкарыстоўваць у гаспадарках і для лячэння іншых жывёл.

**Прадстаўнік Інстытута мяса-малочнай прамысловасці Кацярына БЯСПАЛАВА** *(на фота)* прэзентавала навінку ў сферы харчавання — сухую хуткарастваральную сумесь на малочнай аснове для гарачых напояў.

— На беларускім рынку прадстаўлена шмат падобных прадуктаў, але ўсе яны — замежныя. Наш з'яўляецца першым айчынным аналагам, мы прапануем выключна малочны склад сыравіны, толькі натуральныя кампаненты. Для стварэння сумесі патрабуюцца малако да 15 працэнтаў тлустасці і патака. Па тэхналогіі прыгатавання гэта не вельмі доўгі працэс, адбываецца ён метадам сухога змешвання нармалізаванай сумесі або вырабу на распыляльных сушылках. Такі прадукт падыходзіць для аўтаматаў па продажы гарачых кававых напояў. Арыенціровачны кошт навінкі будзе на 50 працэнтаў меншы за імпартныя аналагі. Сухую сумесь можна захоўваць каля паўгода, яна не страціць сваіх смакавых якасцяў, — расказала Кацярына Бяспалава.

Сёння ўжо з'явілася зацікаўленасць у прадукце з боку некаторых прадпрыемстваў і гандлёвых прадстаўніцтваў. Таму, магчыма, што праз пэўны час мы ўбачым гэтую навінку ў продажы.

Па выніках адбору ў фінал рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» прайшлі 25 праектаў Нацыянальнай акадэміі навук. Нагадаем, ён адбудзецца ў студзені.

**Дар'я ШЛАПАКОВА, фота аўтара.**

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «АЙФОНОМАНИЯ. Тур 2»

В настоящих правилах проведения рекламной игры «Айфономания. Тур 2» (далее — Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Товары-партнеры —** товары, указанные в таблице № 1 п. 8 настоящих Правил, а также на сайте Интернет-магазина www.e-dostavka.by.

**Рекламный игровой код —** это семизначное число, которое присваивается участнику при соблюдении правил участия в Рекламной игре «Айфономания. Тур 2» (далее — Рекламная игра, Игра).

**Розыгрыш —** розыгрыш Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной игры.

**Участник —** физическое лицо, которое приобрело один или несколько Товаров-партнеров и выполнило требования, необходимые для участия в Рекламной игре.

**Кассовый (товарный) чек —** документ, подтверждающий факт приобретения товаров, в том числе одного или нескольких Товаров-партнеров, который должен содержать сведения о номере документа, наименование продавца, дату продажи, наименование, количество и цену товара, итоговую сумму.

Фактом покупки товара в интернет-магазине www.e-dostavka.bv является факт выдачи продавцом кассового и/или товарного чека после оплаты товара покупателем (получателем).

**Персональные данные —** совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать (или проверить) в личном кабинете, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно),
- адрес электронной почты (желательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно).

**Сайт Интернет-магазина —** www.e-dostavka.by.

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

**2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «ИНТЕРНЕТ-МАГАЗИН ЕВРООПТ», Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Западный промузел, ТЭЦ-4, каб. 229.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь или национальный паспорт той страны, гражданином которой он является, или документ, подтверждающий личность (для лиц без гражданства), и постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет (далее по тексту — Участники).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Наименование Рекламной игры:** «Айфономания. Тур 2».

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 23 декабря 2019 г.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 31 января 2020 г.

**8. Наименования товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** товары, реализуемые в Интернет-магазине e-dostavka.by на территории Республики Беларусь, с обязательной покупкой одного или нескольких следующих Товаров-партнеров:

*Таблица № 1:*

| № п/п | Наименование товара-партнера |
|---|---|
| 1 | TIDE Авт СМС порошк. Альпийская свежесть 12 кг |
| 2 | TIDE Авт СМС порошк. Color 12 кг |
| 3 | TIDE Капс 30х24.8 г Колор |
| 4 | TIDE СМС жидк. Color 2х2.47 л |
| 5 | ARIEL Авт СМС порошк. Горный родник 12 кг |
| 6 | ARIEL Авт СМС порошк. Color 12 кг |
| 7 | ARIEL Авт Гель СМС жидк. в растворимых капсулах Liquid Capsules Color 30Х27 г |
| 8 | ARIEL СМС жидк. Color 2х2.6 л |
| 9 | PAMPERS Подгузники Mini Малая Мега Упаковка 144 |
| 10 | PAMPERS Подгузники Active Baby Midi Малая Мега Упаковка 124 |
| 11 | PAMPERS Подгузники Active Baby Maxi Малая Мега Упаковка 106 |
| 12 | PAMPERS Подгузники Active Baby Junior Малая Мега Упаковка 90 |
| 13 | PAMPERS Подгузники Premium Care Mini (4-8 кг) Упаковка 102 |
| 14 | PAMPERS Подгузники Premium Care Midi (6-10 кг) Упаковка 74 |
| 15 | PAMPERS Подгузники Premium Care Maxi (9-14 кг) Упаковка 54 |
| 16 | PAMPERS Подгузники Premium Care Junior (11-16 кг) Упаковка 42 |
| 17 | PAMPERS Подгузники-трусики Pants для мальчиков и девочек Midi (6—11 кг) Упаковка 86 |
| 18 | PAMPERS Подгузники-трусики Pants для мальчиков и девочек Maxi (9—15 кг) Упаковка 72 |
| 19 | PAMPERS Подгузники-трусики Pants для мальчиков и девочек Junior (12—17 кг) Упаковка 66 |
| 20 | PAMPERS Подгузники-трусики Pants для мальчиков и девочек Extra Large (15+ кг) Упаковка 60 |
| 21 | PAMPERS Детские влажные салфетки Sensitive 4Х52/56 |
| 22 | FAIRY Средство для мытья посуды Гранат 1,35 л |
| 23 | FAIRY Средство для мытья посуды Нежные руки Ромашка и витамин Е 1,35 л |
| 24 | FAIRY Средство для мытья посуды Сочный лимон 1,35 л |
| 25 | MR PROPER Моющая жидкость для уборки Универсал Лимон 1,5 л |
| 26 | MR PROPER Моющая жидкость для полов и стен Горный ручей и прохлада 1,5 л |
| 27 | FAIRY Platinum All in 1 Ср-во д/мытья посуды в капсулах д/автоматических посудомоечных машин 50 шт. |
| 28 | FAIRY All in 1 Средство для мытья посуды в капсулах для автоматических посудомоечных машин 65 шт. |
| 29 | GILLETTE Fusion ProShield Бритва с 1 сменной кассетой |
| 30 | GILLETTE Fusion ProGlide Flexball Бритва с 1 сменной кассетой |
| 31 | GILLETTE VENUS Swirl Бритва с 1 сменной кассетой |
| 32 | GILLETTE Fusion ProShield Сменные кассеты для бритвы 2 шт. |
| 33 | FUSION ProGlide Сменные кассеты для бритья 2 шт. |
| 34 | MACH3 Сменные кассеты для бритья 2 шт. |
| 35 | MACH3 Сменные кассеты для бритья 4 шт. |
| 36 | HEAD & SHOULDERS Шампунь и бальзам-ополаскиватель 2 в 1 против перхоти Основной уход 900 мл |
| 37 | HEAD & SHOULDERS Шампунь против перхоти Ментол 900 мл |
| 38 | ORAL_B Электрическая зубная щетка Vitality D100.413.1 PRO CrossAction тип 3710 Black |
| 39 | ORAL_B Электрическая зубная щетка (3+ лет) D100.413.2K Cars тип 3710 |
| 40 | ORAL_B Электрическая зубная щетка (3+ лет) D100.413.2K Frozen тип 3710 |
| 41 | ORAL_B Насадки для электрических зубных щеток Детские EB10 2 шт. |
| 42 | ORAL_B Насадки для электрических зубных щеток Stages Power EB10K 2 шт. |
| 43 | ORAL_B Насадка для электрической зубной щетки CrossAction EB50-2 2 шт. |
| 44 | ПН Gillette Mach3 бритва с 1 сменной кассетой и Head&Shoulders шампунь Основной уход 200 мл |
| 45 | ПН пена для бритья Gillette Series 250мл и бальзам п/бритья Gillette Series Sensitive Skin 100 мл |
| 46 | ПН Venus Smooth бритва с 2 сменными кассетами и гель Satin care для чувствительной кожи 75 мл |
| 47 | ПН Head&Shoulders шампунь Комплексный уход 2 в 1 360 мл (кибер дизайн)+ Old Spice дезодорант спрей 150 мл Captain |
| 48 | OS гель Bearglove 250 мл + OS Тверд дез Bearglove 50 мл + Пена Gill TGS 100 мл + Зубн щетка Oral-B Ultra Thin Черн чай — косметичка в ПОДАРОК |
| 49 | Подарочный набор ORAL_B Электрическая зубная щетка Vitality D12.513 3D White (тип 3709) |
| 50 | ПН ORAL_B Электрическая зубная щетка Stages Power Frozen D12.513K (тип 3709) + чехол |
| 51 | ПН HESS Шмп 400+Блз МарокАрганМасло 180 мл |
| 52 | ПН HESS Шмп 400 мл+Блз БелГрейпМята 180 мл |

Полный перечень Товаров-партнеров, участвующих в Рекламной игре, указан также на сайте Интернет-магазина www.e-dostavka.by.

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица (ЗАО «ИНТЕРНЕТ-МАГАЗИН ЕВРООПТ») в размере 15 807,30 (пятнадцать тысяч восемьсот семь белорусских рублей 30 копеек). Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы (далее — Призы):

*Таблица № 2:*

| Приз | Кол-во, шт. | Номинал за ед., бел. руб. | Всего стоимость бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Приз 1 | | | |
| Смартфон Apple iPhone 11 PRO 64 GB Midnight Green, Model A2215, MWC62 | 5 | 2 332,50 | 11 662,50 |
| Денежное вознаграждение | | 328,96 | 1 644,80 |
| Приз 2 | | | |
| Подарочный сертификат на покупку товаров в интернет-магазине e-dostavka.by, номиналом 50 рублей Срок действия 17.01.2020— 17.02.2020 | 50 | 50,00 | 2 500,00 |
| ИТОГО: | | | 15 807,30 |

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо:

- в срок с 23.12.2019 г. по 12.01.2020 г. включительно совершить покупку на сайте Интернет-магазина www.e-dostavka.by на сумму не менее 70,00 белорусских рублей любых товаров, в том числе 1 либо несколько Товаров-партнеров, указанных в таблице № 1 п. 8 настоящих Правил. За каждую приобретенную единицу Товара-партнера покупателю начисляется один Игровой код.
- в срок с 00:00:00 23.12.2019 г. по 23:59:59 12.01.2020 г. достоверно заполнить Персональные данные (либо проверить корректность ранее заполненных данных) и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре в личном кабинете.

В случае если Персональные данные и согласие на участие в рекламных мероприятиях было подтверждено ранее, повторное подтверждение не требуется.

10.2. Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.).

Каждому покупателю, который совершил действия, указанные в п.10.1 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного Игровой код на дату и время выдачи продавцом кассового и/или товарного чека после оплаты товара покупателем (получателем).

**11. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших Участников Рекламной игры:**

11.1. В розыгрыше Призов участвуют Игровые коды, начисленные за покупки только тех участников, которые указали необходимые Персональные данные в личном кабинете и подтвердили свое согласие на участие в Рекламной игре в сроки, указанные в п. 10.1 настоящих Правил.

11.2. Участник, не выполнивший действия, указанные в п.10, не участвует в Розыгрыше Призов.

11.3. Розыгрыш Призов проводится в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, офис 507.

К моменту розыгрыша Призов Организатором формируется Список Игровых кодов по возрастанию, сформированный согласно п.10.2 настоящих Правил (далее — Список), с указанием фамилии, имени, отчества Участников, даты и времени выдачи продавцом кассового и/или товарного чека, а также даты и времени подтверждения согласия на участие в Рекламной игре. Все Игровые коды имеют одинаковую разрядность.

*Таблица № 3:*

| Дата и время розыгрыша | Участвуют Игровые коды, присвоенные за покупку, совершенные в период | Участник подтвердил свое участие в Игре, заполнив Персональные данные в личном кабинете | Призы для розыгрыша |
|---|---|---|---|
| 17.01.2020, в 12:00 | с 23.12.2019 (00:00:00) по 12.01.2020 (23:59:59) | Не позднее 23:59:59 12.01.2020 | Приз 1, 5 штук. Приз 2, 50 штук. |

Вышеуказанные Призы разыгрываются в порядке, указанном в Таблице № 3.

11.4. Определение победителей Призов «Приз 1», «Приз 2»:

Для проведения розыгрыша используется лототрон и 10 одинаковых непрозрачных шаров с цифрами от 0 до 9 внутри. Определение номеров Победителей происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Для определения первой слева цифры номера Победителя лицо, проводящее розыгрыш, помещает в лототрон шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера Участника согласно соответствующему списку. Шары перемешиваются, из лототрона путем случайной выборки извлекается шар, номер которого определяет искомую цифру. Для определения второй и последующих цифр номера Победителя в лототрон загружаются все десять шаров. После извлечения каждого шара производится проверка на соответствие полученной комбинации цифр номеру Участника согласно соответствующему списку. При отсутствии полученной комбинации цифр в номерах по списку извлеченный шар не возвращается в лототрон, а лицо, проводящее розыгрыш, извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация не совпадет с номером Участника по списку. Процедура повторяется до определения 5 (Пяти) Победителей Приза 1 и 50 (Пятидесяти) Победителей Приза 2.

11.5. Результат Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, подписанном присутствующими на заседании членами комиссии.

**12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша.**

12.1. Победители Призов «Приз 1» и «Приз 2» извещаются о выигрыше не позднее 22.01.2020 посредством уведомления на адрес электронной почты, указанный при регистрации в личном кабинете на сайте Интернет-магазина, а также SMS-рассылки на абонентские номера мобильных телефонов сотовых операторов.

12.2. Для получения Призов Победителям необходимо выполнить следующие действия:

- Для получения Приза 2 Победителю необходимо осуществить активацию электронного подарочного сертификата в разделе «Мои промокоды» в личном кабинете на сайте Интернет-магазина при совершении покупки в срок не позднее 17.02.2020. Подарочные сертификаты будут доступны для активации в личном кабинете Победителя в день розыгрыша.
- Для получения Приза 1 Победитель должен приехать в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11-509 в будние дни с 10.00 до 16.00 в период с 22 января 2020 года по 31 января 2020 года, а также в субботу 25 января 2020 года с 10.00 до 13.00, предварительно связавшись с Организатором по телефонам +375 17 363 02 76, +375 17 363 12 78.

12.3. Для получения Приза 1 Победитель обязан предъявить паспорт гражданина Республики Беларусь (или вид на жительство), национальный паспорт той страны, гражданином которой он является, или документ, подтверждающий личность (для лиц без гражданства), а также подписать все необходимые документы, связанные с получением приза.

12.4. В соответствии с главой 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Приза 1 выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из денежных средств Приза 1.

12.5. Организатор не оплачивает Победителям Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения призов.

12.6. В случае если Победителем Рекламной игры является несовершеннолетний Участник, призы выдаются законному представителю (родителю, усыновителю, попечителю) при предъявлении паспорта гражданина Республики Беларусь / вида на жительство на территории Республики Беларусь законного представителя и свидетельства о рождении ребенка (иного документа, подтверждающего представительство несовершеннолетнего лица).

12.7. В случае если Победитель не может получить Приз 1 лично, Приз 1 может получить его доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство) и доверенности от Победителя, заверенной нотариально, а также подписать все необходимые документы, связанные с получением приза.

12.8. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

12.9. Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с призами, возникшие после передачи Победителям.

12.10. В случае если призы не получены в установленные Правилами Рекламной игры сроки, призы остаются в распоряжении Организатора.

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры, регламент деятельности.**

13.1. Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

- Зорина Мария Сергеевна, специалист по маркетингу, ЗАО «Интернет-магазин Евроопт»;
- Юрченко Артем Григорьевич, начальник отдела маркетинга, ЗАО «Интернет-магазин Евроопт»;
- Прыгунова Ольга Юрьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;
- Чикилева Елена Александровна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;
- Костюк Дарья Валерьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА».

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

14.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 24.01.2020 включительно.

14.3. Имена Победителей Рекламной игры будут размещены на сайте Интернет-магазина.

14.4. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить по телефону горячей линии 440 с 08.30 до 20.30.

**15. Прочие условия**

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

15.2. Участники Рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые для получения выигрыша документы, предоставляемые Организатором Рекламной игры.

15.3. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и(или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

15.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

15.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

15.6. Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11-509.

*Свидетельство № 3711 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 12 декабря 2019 г.*

Знайсці паразуменне

# Дагвокер для гадаванца

**Няма з кім пакінуць сабаку на час адпачынку або камандзіроўкі? Не хвалюйцеся, у Мінску ёсць тыя, хто дапаможа вам і вашаму гадаванцу. Гэта дагвокеры.**
**19-гадовая Марыя КІРДУН — адна з іх, яна прафесійна займаецца такой справай больш за пяць гадоў. Калі казаць проста і коратка, дагвокер — чалавек, які выгульвае чужых сабак. Падчас вучобы ў Мінскім радыётэхнічным каледжы дзяўчына хацела знайсці дадатковы заробак, але паступова гэты занятак захапіў яе ўсур'ёз.**

— Я пачынала працаваць з двума сабакамі: метысам таксы і лабрадорам. Мы досыць доўга займаліся, каля года. З часам кліентаў станавілася ўсё больш, а разам з імі прыходзіў і вопыт. Я вывучала трэнінгі, глядзела розныя відэа пра сабак. Цяпер раблю ўхіл больш на кіналогію. На гэты момант яшчэ працую і праграмістам, але гэта не перашкаджае мне гуляць з маімі пастаяннымі «кліентамі», — дзеліцца Марыя.

Па словах суразмоўніцы, апошнім часам кірунак стаў актыўна развівацца. Тым больш што з'явілася шмат школьнікаў, якія хочуць зарабіць хуткія грошы, бо гэта не той занятак, дзе патрабуецца, як яны лічаць, якая-небудзь адукацыя. Літаральна пяць гадоў таму адпаведныя прапановы былі не вельмі запатрабаваныя: малая колькасць кліентаў, нізкія цэны на паслугі.

— Сапраўды, на думку некаторых, гэта адзін з самых простых спосабаў зарабіць. Але ўсё не зусім так. З чужымі сабакамі вельмі складана працаваць, а калі ў цябе яшчэ і навыкаў няма, жывёла не будзе слухацца, не атрымаецца яе кантраляваць і вучыць. Школьнікі звычайна ў нашай сферы надоўга не затрымліваюцца: прыходзяць на месяц, максімум — на паўгода, — расказвае Марыя. — Ды і з жывёламі нельга працаваць толькі дзеля грошай: гэта адразу адчуваецца. Уладальнікі захочуць карыстацца паслугамі на пастаяннай аснове толькі ў тым выпадку, калі будуць бачыць, што сабака добра ўспрымае вас. Ёсць выдатная фраза, якую сказаў мне кінолаг, які вучыў мяне: «Дагвокер для сабакі — гаспадар, які з ім не жыве».

Парода жывёлы не моцна ўплывае на тое, ці будзе запрошаны чалавек з ім працаваць. Дагвокер проста сам глядзіць, ці атрымаецца ў яго справіцца з тым жа алабаем, напрыклад. Тут больш важнае, як добра сабака выхаваны, ці займаліся з ім гаспадары.

— Прагулкі звычайна праходзяць па двух сцэнарыях: з ланцужком і без. Па другім варыянце толькі ў тых выпадках, калі дазволіў уладальнік жывёлы, а сабака вас слухае і, самае галоўнае, ён ужо сам умее гуляць свабодна. Бо калі яго гэтаму навучыць дагвокер, ёсць магчымасць таго, што гадаванец перастане слухацца... гаспадара, — працягвае аповед пра нюансы свайго занятку Марыя.

Колькі на выгуле сабак можна зарабляць? У гэтай рабоце ўсё залежыць ад таго, хто прапануе паслугі. Калі браць шмат кліентаў — а гэта тры-чатыры на пастаяннай аснове — і калі ў дагвокера ёсць вопыт работы, ён разбіраецца ў кіналогіі, яго любяць жывёлы, за ўсё гэта будуць добра плаціць. Цэны часцей за ўсё дагаворныя. Пачаткоўцы атрымліваюць ад пяці рублёў за адну гадзіну прагулкі. У больш вопытных сярэдні заробак складае 7—15 рублёў.

У некаторых кампаніях, якія займаюцца выгулам, кошт залежыць ад памеру сабакі: маленькія — чатыры рублі, сярэднія — пяць і вялікія — шэсць рублёў. І гэта за 20—30 хвілін. У апошнім выпадку ў сярэднім за адну гадзіну прагулкі з прафесійным дагвокерам гаспадар гадаванца аддасць каля дзесяці рублёў.

**Святлана ЛАЖЭВІЧ, вучаніца 11 класа СШ № 54 Мінска.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**

Галасы маладых

# Творчы акорд крэатыўнага ратавальніка

**Амерыканскі акцёр Роберт Дэ Ніра аднойчы зазначыў: талент — гэта перш за ўсё ўменне зрабіць правільны выбар. Калісьці так і паступіў старшы інспектар сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Першамайскага раённага аддзела Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Раман ПЯСЬКОЎСКІ. Сёлета яму скарыўся прафесійны конкурс «Найлепшы прапагандыст». У гэтым Раману вельмі дапамагло імкненне да творчасці.**

Мы гутарым у яго службовым кабінеце, сцены якога ўпрыгожаны не толькі атрыбутыкай ратавальнікаў, але і кружэлкамі. Справа ў тым, што ў вольны ад службы час Раман іграе на гітары і піша вершы.

— З дзяцінства вельмі цягнула да музыкі. Пазычыў неяк інструмент у сябра і па некалькі гадзін штодня асвойваў акорды. Так, было цяжка, смылелі пальцы, але я не здаваўся. А пасля раз гуляў у парку і выпадкова сустрэў там хлопца, які таксама вельмі захапляўся музыкай. Так мы вырашылі стварыць уласны гурт.

Пры гэтым Раман — не толькі музыкант. Да моманту гэтай сустрэчы ў яго ўжо было напісана некалькі дзясяткаў тэкстаў, якія чакалі свайго часу. Але, што дзіўна, хлопец у музычную школу не хадзіў, таму што вучыўся ў... мастацкай. Яе ён скончыў на «выдатна».

Як жа такі рознабаковы чалавек вырашыў не паступаць у творчую навучальную ўстанову, а акунуцца ў складаныя і жорстка рэгламентаваныя будні ратавальнікаў?

— Я ніколі не хаваў таго, што мяне выхоўвала толькі маці, якая працавала тады выхавацелькай у дзіцячым садку. Бабуля і дзядуля, канешне, падтрымлівалі як маглі, але цалкам на іх спадзявацца таксама было б няправільна. Сам я родам з Клімавіч. Разумеў, што пры пераездзе на вучобу ў вялікі горад выйсце толькі адно — знайсці навучальную ўстанову з сацыяльнымі гарантыямі. Іншы варыянт мы проста не пацягнулі б. Так выбар і спыніўся на Універсітэце грамадзянскай абароны. Тым больш што я з дзяцінства вельмі любіў спорт. Займаўся футболам, плаваннем, лёгкай атлетыкай...

Творчыя здабыткі вельмі дапамагалі Раману падчас вучобы, ён удзельнічаў у мноcтве адпаведных конкурсаў. А калі курсанцкія пагоны нарэшце змяніліся на афіцэрскія, пачаў крэатывіць у сваёй рабоце. Напрыклад, перад выступленнямі ў дзіцячых садках ён піша сцэнарыі да ўласных тэатралізаваных пастановак, у якіх, дарэчы, удзельнічае і як акцёр.

— Выступаць перад малымі — гэта цэлае майстэрства. Тут важна ўсё: час, інтанацыя, тэмбр і нават правядзенне фізкульт-хвілінак. Але расказваць пра правілы бяспекі трэба ў нязвыклай і цікавай форме. Толькі тады дзеці запомняць іх надоўга. Лейтматыў пастановак просты — папулярныя казачныя героі трапляюць у непрыемныя сітуацыі і ў рэшце рэшт знаходзяць правільныя рашэнні. І калі бачыш на тварах малых усмешкі і задаволенасць, разумееш, што ўсё гэта робіцца не дарэмна. А вось у школах, наадварот, трэба валодаць слэнгам падлеткаў. Бо адзін са «стаўпоў» поспеху — гэта паставіць сябе на адзін узровень з тваёй аўдыторыяй.

Удзел у конкурсе «Найлепшы прапагандыст» для Рамана — не першы. Чатыры гады таму яму не хапіла ўсяго двух балаў, каб скарыць гэтую вяршыню, — тады ён спыніўся на другім месцы. І вось сёлета хлопцу выпаў яшчэ шанц.

— Я ішоў ва-банк. Пасля «серабра» арыенцірам для мяне было толькі «золата». Плюс заключаўся ў тым, што некаторыя этапы спаборніцтва былі скіраваны менавіта на крэатыў яго ўдзельнікаў. Напрыклад, на конкурсе сацыяльных праектаў стаяла задача данесці інфармацыю пра правілы бяспечных паводзін людзям састарэлага ўзросту ў цікавай для іх форме. У выніку мы арганізавалі спецыяльную гульню кшталту «Поля цудаў». А аўдыяролік, прысвечаны тэме пажараў ад выпальвання сухой расліннасці, я запісаў на матыў славутай песні «Касіў Ясь канюшыну».

Адзін такі пажар назаўжды ўрэзаўся Раману ў памяць. Адразу пасля заканчэння вучобы ён праходзіў службу на сваёй малой радзіме, у Клімавічах. І вось вясной 2014 года пад пагрозай знішчэння апынулася цэлая вёска. Малады начальнік каравула разам з разлікам адстаяў яе ў агню.

...Раман паказвае свой штодзённік. Ён у прамым сэнсе слова нагадвае чыгуначны расклад — усё распісана па гадзінах максімальна дакладна.

— Я ўжо доўгі час жыву ў такім рэжыме, калі імкнешся паспець зрабіць максімум. Насамрэч гэта вельмі дысцыплінуе і дазваляе нічога не забыць. Але, як бы там ні было, штодня ўвечары імкнуся выкраіць час на чытанне. Хоць проста для таго, каб пераключыць увагу і даведацца нешта новае. Бывае, што затрымліваюся на рабоце, асабліва калі знаходжуся ў аператыўнай групе. І выхадныя ў мяне таксама распланаваны. Але калі не будзеш нічога рабіць, то нічога і не атрымаецца, хіба не так?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота з архіва героя.**

# НАТУРАЛЬНЫ МІНІМАЛІЗМ НА ДВАІХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Цікава, колькі часу трэба, каб зрабіць адну рэч?***

**Антон:** — Ад дзвюх гадзін да пяці дзён у залежнасці ад асаблівасцяў выканання. Мы працуем з аднолькавымі артыкуламі скуры, але з рознымі фарбамі. Прытрымліваемся канвеернага (паэтапнага) прынцыпу вытворчасці, так рацыянальней размяркоўваюцца абавязкі і хутчэй ідзе работа. Выраб скураных рэчаў — нялёгкая справа, у майстэрні мы знаходзімся з раніцы да позняга вечара. Але гэта менавіта той занятак, які нам прыносіць задавальненне і радасць, таму не заўважаем гадзін, якія прайшлі.

***— А чаму працуеце менавіта ў стылі мінімалізму?***

**Вікторыя:** — Мы робім універсальныя рэчы, якія падыходзяць пад вызначэнне «класіка». Трэнды хутка мяняюцца, і не хочацца выпускаць нешта на адзін сезон. Мы за разумнае спажыванне, якое прадугледжвае



ачышчэнне прасторы ад лішніх ці непатрэбных рэчаў.

**Антон:** — Тэрмін службы нашага рэмня — дзесяць гадоў. Лічым, што гэта эканомія грошай у доўгатэрміновай перспектыве.

***— Што ў кліентаў карыстаецца найбольшым попытам? Як імкняцеся ім дагадзіць?***

**Антон:** — Рэч, якая, на наша здзіўленне, стала вельмі папулярная, — арганайзер для правадоў. Калі мы ўключалі яго ў пералік тавараў, думалі, што гэты аксесуар будзе цікавы толькі вузкай аўдыторыі. Але калі заказаў стала так многа, што работнікі пошты пачалі азірацца ўслед, зразумелі, што памыляліся.

**Вікторыя:** — Пастаянна думаем, што можна змяніць, дадаць, прыбраць, каб удасканаліць мадэль. Напрыклад, раней у кашальках былі больш закругленыя краі, плаўныя лініі і іншы выгляд бірак. Мы адсочваем тэндэнцыі, у тым ліку ў блогераў, каб не прапусціць трэндавыя рэчы, але не здраджваем уласнаму стылю — мінімалізму. Заўсёды думаем пра тое, чым будзе карысная тая ці іншая рэч нашаму пакупніку. А яшчэ разам з падпісчыкамі ў Instagram-профілі прыдумляем імёны для сваіх сумачак. Гэта крута, бо людзям падабаецца мець зваротную сувязь з намі і быць датычнымі да стварэння чагосьці новага.

***— Хто вашы асноўныя спажыўцы?***

**Вікторыя:** — У Instagram аўдыторыя на 95 працэнтаў складаецца з дзяўчат і жанчын узростам ад 20 да 45 гадоў. Спачатку ў нас быў агульны профіль для мужчынскіх і жаночых вырабаў, аднак праз пэўны час убачылі: хлопцы адразу губляюцца ў безлічы жаночых аксесуараў. Таму цяпер маем дзве асобныя старонкі. Таксама ў планах адкрыць YouTube-канал і задзейнічаць іншыя сацсеткі.

**Антон:** — Працэнтаў 80 заказаў робяць мінчане. Аднойчы за дзень мы адправілі некалькі пасылак на адну і тую ж вуліцу, у адзін дом *(усміхаецца)*.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва суразмоўнікаў.**
*Мінск — Гомель — Мінск.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «МГЦН» 21 января 2020 г. проводит 271-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)**

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель — УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, тел.: +375 (17) 225 61 21, +375 (17) 225 69 77** | | | | | | | |
| 56 | г. Минск, пл. Привокзальная, 5 | 1,0 | 1,8 БАВ | 4,23 | Под установку стойки администратора отделения банка | 0,40 | Площадь расположена в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (отметка +4,350, 2-й этаж). Имеются: центральное отопление, естественное освещение. В ТЦ «Галилео», имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, станция метро «Площадь Ленина». **Срок аренды — 3 года.** |
| 57 | г. Минск, пл. Привокзальная, 5 | 1,0 | 4,0 БАВ | 4,23 | Под установку банкомата, инфокиоска, платежно-справочного терминала, валютно-обменного терминала | 0,40 | Площадь расположена в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (отметка +8,550, 3-й этаж, правое крыло вокзала, зал ожидания). Имеются: центральное отопление, естественное освещение В ТЦ «Галилео», имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, станция метро «Площадь Ленина». **Срок аренды — 3 года.** |
| 58 | | 1,0 | 4,0 БАВ | 4,23 | | 0,40 | |
| 59 | | 1,0 | 4,0 БАВ | 4,23 | | 0,40 | |
| 60 | | 1,0 | 4,0 БАВ | 4,23 | | 0,40 | |
| **Арендодатель — БелНИИТ «Транстехника», тел.: +375 (17) 331 79 69, +375 17 292 22 04** | | | | | | | |
| 61 | г. Минск, ул. Платонова, 22а | 178,7 | 1,0 | 755,01 | Под склад | 75,5 | Встроенные изолированные помещения в подвале площадью 28,8 кв. м, 33,1 кв. м, 39,7 кв. м, 17,4 кв. м, 53,0 кв. м, 6,7 кв. м. Стены железобетонные, перегородки кирпичные, пол бетонный. Имеются: дверь металлическая, центральное отопление, электропроводка, освещение. Санузел отсутствует |
| 62 | г. Минск, ул. Платонова, 22 | 360,0 | 2,0 | 1 521,00 | Под склад | 152,1 | Здание ангара арочного типа из гофрированной стали размером 12Ч30 м. Высота здания — 7,75 м. Фундамент из железобетонных блоков высотой 1 м |
| **Арендодатель — РУП «Белмедтехника», тел. +375 (17) 220 57 53** | | | | | | | |
| 63 | г. Минск, ул. М. Богдановича, 62 | 20,6 | 3,0 | 87,04 | Под административные цели (офис) | 8,70 | Часть изолированного помещения (кабинет № 3) на 1-м этаже жилого дома. **Срок аренды — 3 года.** ***(35*)*** |
| 64 | г. Минск, ул. М. Богдановича, 62 | 26,4 | 3,0 | 111,54 | Под административные цели (офис) | 11,10 | Часть изолированного помещения на 1-м этаже жилого дома, состоящее из двух помещений: кабинет № 4 (6,8 кв. м) и кабинет № 5 (19,6 кв. м). Вход в помещения через кабинет № 3. Возможно устройство отдельного входа за счет средств арендатора без последующего возмещения затрат. **Срок аренды — 3 года.** ***(35*)*** |
| 65 | г. Минск, ул. М. Богдановича, 62 | 46,9 | 3,0 | 198,15 | Под административные цели (офис) | 19,80 | Часть изолированного помещения на 1-м этаже жилого дома, состоящее из кабинета № 20 (31,9 кв. м) и кабинета № 21 (15,0 кв. м). Режим работы арендатора в рамках режима работы подразделений УП «Белмедтехника», находящихся в данной части изолированного помещения. **Срок аренды — 3 года.** ***(35*)*** |
| | ***35**** *В помещении имеются: естественное и искусственное освещение, электроснабжение, отопление, охранная и пожарная сигнализации. Один общий санузел во всем изолированном помещении. Раздельный учет теплоэнергии и электроэнергии отсутствуют* | | | | | | |
| **Арендодатель – РУП «Белстройцентр», тел. +375 (33) 300 41 33** | | | | | | | |
| 66 | г. Минск, ул. Притыцкого, 87-218 | 18,0 | 7,1 БАВ | 76,05 | Под хранение автомобиля | 7,60 | Подземный этаж, ограждающие конструкции – разметка. **Срок аренды — 1 год** |
| **Арендодатель — ОАО «Дрожжевой комбинат», тел.: +375 (17) 328 64 32, +375 (17) 328 64 39** | | | | | | | |
| 67 | г. Минск, ул. Смоленская, 2В | 100,2 | 25,05БАВ | 423,35 | Под административный цели, склад, иные виды деятельности, возможные на данных площадях | 42,30 | Помещения перекачки сырья (74,0 кв. м) и мастерская (26,2 кв. м) на 2-м этаже здания сливного пункта сырья. Отопление отсутствует. **Срок аренды 3 года.** ***(36*)*** |
| | ***36**** *Необходимые условия: проведение технической экспертизы состояния несущих конструкций, проведение ремонта, разработка проекта на электроснабжение, установка индивидуального электросчетчика. С согласия арендодателя возможно осуществление перепланировки в соответствии с требованиями законодательства. Все работы осуществляются за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат* | | | | | | |
| **Арендодатель – Учреждение «Национальный художественный музей Республики Беларусь», тел. +375 (17) 328 68 44** | | | | | | | |
| 68 | г. Минск, ул. К. Маркса, 24 | 353,95 в т. ч.: 110,76 (подвал); 196,69 (1-й этаж); 46,5 (кафе-бар на 1-м этаже) | 3,0 | 1 495,44 | Под объект общественного питания | 149,50 | Помещения подвала и 1-го этажа находятся в здании, которое является материальной историко-культурной ценностью категории «3». Здание не функционирует, находится в стадии реставрации и входит в состав 4-го пускового комплекса объекта «Реставрация и приспособление единого комплекса зданий Национального художественного музея Республики Беларусь». Изменение арендуемой площади после реконструкции здания согласно новому техническому паспорту. **Аренда с момента ввода здания в эксплуатацию сроком на 10 лет.** ***(37*)*** |
| | ***37**** *Необходимые условия по финансированию за счет средств арендатора без последующей компенсации следующих работ и затрат по:*<br>1. Работам по корректировке проектно-сметной документации.<br>2. Закупке материалов, устройству финишной отделки стен, потолков, а также заполнений внутренних дверных проемов в гостевых зонах.<br>3. Закупке, поставке, монтажу и наладке внутренних инженерных систем и оборудования помещений (кондиционирование, светильники, электроустановочные приборы, сантехпосуда и водоразборные устройства, телевидение, ЛВС, система охранной и пожарной сигнализации, технологическое оборудование).<br>4. Закупке и поставке мебели, предметов интерьеров в соответствии с проектно-сметной документацией.<br>5. Услугам заказчика в соответствии с проектно-сметной документацией, по работам, финансируемым за счет арендатора.<br>6. Устройство наружной рекламы.<br>*Необходимые условия:*<br>*1. Требуемое название – ArtMuseumCafe.*<br>*2. Современная национальная кухня (новое разработанное меню).*<br>*3. Форма одежды – дизайн рабочей формы сотрудников кафе согласовывается с администрацией музея с обязательным размещением музейного логотипа и в корпоративном стиле.*<br>*4. Требование к персоналу – владение тремя языками: белорусским, русским, английским.*<br>*5. Применение разработанного в рамках строительства объекта дизайн-проекта (с возможностью внесения предложений).*<br>*6. Режим работы арт-кафе – с 11.00 до 24.00.*<br>*Компенсация понесенных учреждением «Национальный художественный музей Республики Беларусь» затрат по внесению изменений в проектно-сметную документацию (по согласованию и уточнению)* | | | | | | |

БАВ – базовая арендная величина с 01.04.2019 составляет 16,90 рубля.

***Важно***

**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **21 января 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра имущества,** право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель.**

**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением!**) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 270 от 21.01.2020 по предмету аукциона №_____**), перечисляемый на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.** *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;*

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо –*** копии **платежного документа** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 18 декабря 2019 г. по 15 января 2020 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в нем указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона.**

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договоры аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок: отдел аукционов –** + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды –** + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия –** + 375 (17) 328 36 58.

**Интернет: www.mgcn.by**

# ТАКОЕ КІНО

**Юльяна ПЯТРЭНКА**

**Аўтарка рубрыкі «Адкоткі» (ад «не пра коцікаў») расказвае чарговую гісторыю, гэтым разам на стыку жанраў.**

ДОБРЫ сцэнарый звычайна пачынаецца з сумнага эпізоду. Толькі я выйшла з адпачынку на работу, як у нашым доме завёўся Палтэргейст. Баязлівы, клопатны і вельмі надакучлівы.

Першы вечар майго вяртання дадому стаў падобны на містычны трылер: раскіданыя па падлозе нажы, падраныя фіранкі, перакуленая сметніца.

Котка ніколі раней не дазваляла сабе такіх вольнасцяў, каб скакаць па сталах і паліцах. Вось і цяпер яна не адважвалася выйсці ў кухню: насцярожана выглядала з залы, каб упэўніцца, што гэта свае. А потым, абнюхаўшы мяне і торбу, звыкла хрумсцела любімым сухім кормам.

Другі вечар майго вяртання дадому стаў падобны на крымінальную драму: разбітыя кубкі, павалены табурэт і зніклая з талеркі сардэлька. Сонная котка пазяхала і пацягвалася на камодзе.

Трэці вечар нагадаў сапраўдны вестэрн: перакуленыя на падаконніку кактус, раскіданыя каля ўвахода боты і зрашэчаны малакалібернымі кулямі пакецік з сушанай рыбай.

Котка звыкла вастрыла аб дыванок кіпцюры.

Я спадзявалася, што наступны вечар стане падобны на чароўнае фэнтэзі з матылькамі і аднарогамі, ды дзе там...

Буфет і падлога ў крывавых падцёках, на сценах — рэшткі ялавічынага фаршу, які з раніцы размарожваўся ў ракавіне... Ну чым не фільм жахаў?

Віхляючы хвастом, котка назірала праз акно за шумнай зграяй варон. Фортка была адчынена і падрапана знутры — быццам рваўся на волю дзікі звер.

Я не стала чакаць наступнага вечара ў жанры баевіка і вырашыла разыграць свой дэтэктыў.

Ды толькі як можна адпрасіцца з работы ў нашага суровага начальніка? Які там палтэргейст, ён і на вяселле не адпусціць, і за бальнічны ліст нервы выматае, справаздачамі завалiць і пакіне да цемры ў офісе. Нявыхаваны, ганарлівы, скандальны і зайздрослівы, пераканаты толькі ў сваёй праваце.

Дзіўлюся, чаму на галовы адукаваных, сціплых, культурных людзей валяцца такія вось шкоднікі? Заўсёды знойдзецца нехта, хто будзе правакаваць цябе і выбіваць з каляіны.

Спасылаючыся адначасова на мігрэнь, паход да акуліста, школьны бацькоўскі сход і выклік сантэхніка, я ўсё ж збегла з работы. Трэба як мага хутчэй прымераць ролю сышчыка, злавіць Палтэргейст «на жыўца» і тым спыніць яго спробы ператварыць мой дом у руіны.

Дэтэктыў хутка абярнуўся прыгодамі: пастка, зробленая мною са звычайнай пластыкавай сумкі-пераноскі (і прынады ў выглядзе сасіскі), ужо закрылася і моцна трымала ў сваіх абдымках Сусветнае Зло, цікаўнае і галоднае. Адно тырчаў з яе чорны кашлаты хвост.

Пры маім набліжэнні пераноска злосна зашыпела і падскочыла. Каб супакоіць і задобрыць Палтэргейст, я шпульнула ў сумку яшчэ адну сасіску — але гэтага імгнення было дастаткова, каб касматае нячэсанае стварэнне апынулася на волі. Яно выгнула чорную спіну, раздражнёна мяўкнула і знікла ў адчыненай фортцы.

Відаць, Каралева Марго сумавала адна, таму вырашыла пазабаўляцца з дапамогай чарговага прыдворнага блазна. Кручок знутры адкідваецца даволі лёгка. Вось і пацвердзілася простая ісціна: дай галоднаму рыбы — і ты накорміш яго вячэрай, навучы галоднага лавіць рыбу (лазіць у акно) — і ты накорміш яго на ўсё жыццё.

— Што глядзіш? — звярнулася я да сваёй коткі, якая лупіла хвастом па баках, седзячы ў фатэлі. — Хто акно адчыняў? Усіх сяброў да нас вадзіць будзеш? Эй! Я з табой размаўляю?!

Котка ў адказ вінавата заплюшчыла вочы.

Нашы гадаванцы будуць уважліва, апусціўшы галовы, слухаць папрокі і нават пагаджацца. А пасля, у нашу адсутнасць, зноў возьмуцца за сваё. Сорам у іх ёсць. А вось сумлення — ні на грам. Ну проста як некаторыя людзі (кшталту майго начальніка)! Толькі ў людзей акрамя схільнасці шкодзічаць ёсць яшчэ схільнасць бяздзейнічаць. Гэта калі ты павінен быў нешта зрабіць — а не зрабіў. Не дапамог, не растлумачыў, не пазычыў, не адказаў. Быццам мінуў возера, у якім тоне чалавек, і падумаў: а я тут пры чым? Лёс у яго такі...

Дапамагчы ўсім катам у ваколіцах я не магу.

Можна даводзіць колькі заўгодна, як жывёлы вучаць нас дабрыні, адказнасці і клапатлівасці. У маім выпадку я зразумела толькі адно: час мяняць вокны. Ратаванне тапельцаў — справа лап саміх тапельцаў.

Праз два дні ў доме было чыста, ціха і спакойна, як у казцы. Марго сустракала мяне па гэты бок акна, а Злосны Палтэргейст — па той. Ківаўся на заснежаным плоце паміж голымі яблыневымі галінамі і не зводзіў з мяне жоўтых пільных вачэй.

«Ну хто яшчэ выратуе гэтага тапельца?..» — я ўздыхнула і выставіла за дзверы міску з кашай. Наступным вечарам — з кашай і маслам. А яшчэ праз дзень — з фаршам. Злыдзень прыходзіў ціха і гэтак жа ціха знікаў, пакідаючы пустую пасудзіну.

Калі пасыпаў буйны мокры снег, я задумалася пра цёплы ўтульны дом для Палтэргейста і расчыніла насцеж дзверы. Дзьмуў калючы вецер, набліжалася ноч.

Я чакала. А ён знік. Ён не вярнуўся ў наш двор і на нашу вуліцу. Мабыць, усё ж навучыў таму, чаго мне не хапала, і адправіўся вандраваць далей.

А можа, са шкоднымі людзьмі тое самае? Можа, варта знайсці для майго начальніка і іншых такіх, як ён, тую самую «міску з кашай»? Знайсці яе ў сабе, разабрацца, чаго мне не хапае, каб засвоіць урок? Напрыклад, перастаць лезці са скуры, каб падабацца ўсім і кожнаму; перастаць браць на сябе непасільную ношу, каб палягчаць камусьці жыццё; не імкнуцца да толькі найвышэйшых адзнак... Зрэшты, і шчасце, і пакуты знаходзяцца толькі ў нас, у нашым розуме, у светаадчуванні, у галаве — асабістай і найлепшай кіназале, дзе пракручваюцца сотні сцэнарыяў.

Выходзіць, што любы, нават не самы добры чалавек, з'яўляецца не ворагам, а настаўнікам і лекарам, у якім мы маем патрэбу менавіта цяпер. Ён выцягне на святло ўсе нашы хваробы, заганы і недахопы, выявіць эгаізм і самалюбства, беспрынцыповасць, упартасць ці бязлівасць (патрэбнае падкрэсліць). Гэта як пстрычка па носе. Ён выцягне — а ты лячыся. Для кожнага выпадку свае рэцэпты і лекі — у залежнасці ад твайго сумлення і адкрытасці перад сабой.

Я не хачу пражываць меладрамы — таму проста перапішу іх. Нават калі давядзецца выкрасліць з жыцця некаторых людзей.

Пакуль не ідуць тытры — яшчэ не ўсё страчана.

# ГАРБАТА

**Кірыл СТАСЕЛЬКА**



**З дзясятка прапанаваных аўтарам да друку твораў «Маладосць» дзеліцца з чытачамі «Чырвонкі. Чырвонай змены» толькі двума. Гісторыі пра рукаў, абрус, вузел, лыжку, нажніцы, нож, пярсцёнак і цыркуль чакаюць на старонках часопіса. І трэба думаць, што дачакаюцца, бо занадта яны незвычайныя, каб застацца незаўважанымі...**

ГЭТЫ мяшочак з гарбатай дастаўся Вінцэнту — дзеду майго прадзеда — ад графа, у якога ён працаваў архіварыусам. Брат Вінцэнта пакутаваў ад праблем з памяццю. То яна выправіцца ў царства Гіпноса, то пакрыўдзіцца і завядзе ў дрымучыя лясы, то напрыдумляе чаго не было. Аднойчы яна зусім неяк перавярнулася дагары нагамі і брат забыўся ўсё добрае, а ў яго пасудзіне для думак засталося толькі самае кепскае. Крыўда давала аплявуху ўдзячнасці, а ўзлаванасць рыхтавала велізарнае вогнішча для вялікадушнасці. Ад таго ён пакаламуціўся розумам і адплаціў адным бокам манеты сваёй жонцы і дзецям. Вінцэнт вельмі баяўся долі брата, а ад таго вельмі перажываў за ўласную памяць. Ён трымаў яе на кароткім сярэбраным ланцугу і часам пісаў з яе карціны ў тоўстай кнізе са скураной вокладкай.

З часам граф згалеў, але вельмі любіў і паважаў дзеда майго прадзеда. Ставіўся да яго, як мядзведзіца да сваіх дзяцей. Таму, ведаючы пра сына Афрадыты і Арэса, які пільнаваў Вінцэнта, у падзяку за службу падарыў тры рэчы, што атрымаў яшчэ ад свайго брата, які жыў у вечным горадзе і якому іх прывезлі з краіны, што пад небам.

Звычайна знаходка Шэнь-нуна з часам псуецца, але існуюць каштоўныя гатункі, якія з рухам Калы, наадварот, становяцца толькі лепшыя. Менавіта такое лісце гарбаты атрымаў Вінцэнт. Разам з тым граф падарыў парцалянавую чару і адмысловы рэцэпт. «Як людзі з гадамі становяцца горшыя, так, у процілегласць ім, гэты напой становіцца лепшы, — сказаў яму граф. — Заварвай гарбату асаблівым чынам — і гэтая парцалянавая чара будзе захоўваць тваю памяць пласт за пластом на сваіх сценках».

Так Вінцэнт і рабіў, але толькі па асаблівых выпадках, вельмі добрых, калі энтэлехія запаўняла пустэчы, або вельмі дрэнных, калі паглыналіся забароненыя яблыкі. Ён заварваў гарбату графа, і чара асадкам захоўвала ўспаміны пра іх. А варта было яму выпіць з яе, як усё, што Вінцэнт у ёй захаваў, вярталася зноў, быццам гэта адбываецца цяпер: спачатку па руках праз цеплыню, потым праз пахі і, нарэшце, праз смак. Свой скарб ён ніколі далёка не хаваў, каб не забыцца куды. Таму заўсёды насіў на поясе.

Так дзед майго прадзеда пражыў сто дваццаць восеняў, зім, вёснаў і сто дваццаць адно лета ў добрай памяці і розуме. На сто дваццаць першую восень ён, заснуўшы, выпусціў чару з рук, і яна разбілася. Адзін асколак адляцеў нават да суседняга двара (і там успомнілі пра нейкую старую пазыку). Разам з ёй у аскепкі ператварылася і памяць Вінцэнта. Ад таго ён забыўся нават тое, што жыве. А як забыўся, што жыве, дык адразу ж і сканаў.

Мяшочак знайшоў мой бацька шмат гадоў пазней. Піць гарбату з яго ўжо пабойваліся, але і выкідаць не рашаліся.

# СВІСТОК

У Піліпа было шмат пчол, вельмі шмат пчол, надзвычай шмат пчол. Для людзей усе яны здаваліся аднолькавыя, як сляды дзіка на зямлі. Але Піліп кожную мог адрозніць і нават даваў ім імёны. Многія дзівіліся яго фантазіі, бо нават сярод людзей на ўсёй зямлі не злічыць столькі імёнаў. Мясцовыя асцерагаліся хмары, якая няспынна гудзела, а Піліп любіў сваіх пчол і сябраваў з імі. Ён заўсёды падыгрываў ім на гліняным свістку, а яны адорвалі яго найсмачнейшым мёдам.

З'ясі трохі таго мёду, і ў галаве пачынае іграць музыка, якая зразае пустазелле дурных думак, а прыгожыя кветкі прыемных, добрых угнойвае і гадуе. Вочы засцілае вясёлка, якая расла знутры і сыходзіла далёка за гарызонт. Рот пачынае ўбіраць усю саладосць свету, смакаваць яго ад усходу да захаду, ад ягад да зорак. Памажаш скроні і нават на камянях у халодным мокрым лесе моцна ды бесклапотна спіш да світання, быццам пад матчыным пупком. Дзіця на тым мёдзе гадаваць — і дачка вырасце моцная, як зуб мядзведзя, а сын прыгожы, як слёзы месяца, і наадварот — у залежнасці ад таго, шмат мёду адразу даеш або пакрысе.

Пачастуеш тым мёдам карову, і яна дасць у разы больш малака, смак якога аддае лёгкімі ноткамі то здзіўлення, то мяккасці, то цягучасці — у залежнасці ад настрою каровы і напрамку яе хваста. Апусціш пазногаць мёду ў калодзеж, і вада там становіцца чыстая і прамяністая.

Аднойчы прыйшоў да Піліпа тлустаносы мужык ад князя і кажа, што яго гаспадар хоча сабе тых пчол набыць. Піліп адмовіўся хутчэй, чым той паспеў зноў міргануць. Другі раз мужык прыйшоў і прапанаваў заплаціць у два разы больш, але і тады пачуў адмову. Калі трэці раз мужык з'явіўся, паабяцаў утрая, але Піліп зноў не пагадзіўся. Тады мужык сказаў, што калі Піліп не прадасць, то князь проста забярэ ў яго божы падарунак. Не было чаго рабіць, і Піліп мусіў пагадзіцца.

На наступны дзень мужыкі князя прынеслі аплату і забралі пчол. Але яны не ведалі, што ўвесь сакрэт у свістку. Граннем на ім Піліп забаўляў сваіх мядовых сяброў, гутарыў з імі, а часам ім загадваў. Зайграе адну мелодыю, і пчолы ляцяць праз раку. Зайграе іншую, і мёд становіцца саладзейшы.

Пакаштаваў князь свой мёд, а ён цвёрды, як крыўда, і салёны, як сляза дзіка. А праз пяць начэй зайграў Піліп на свістку, і пчолы вярнуліся да яго. Прыйшоў тлустаносы мужык ад князя зноў і сказаў, каб вярнуў пчол, а Піліп адказаў, што гэта зусім іншыя пчолы. Нават назваў усе іх новыя імёны. Тады князь купіў і гэтых. Пакаштаваў мёд, а ён сумны, як дождж, і востры, як кут царквы. Праз чатыры ночы Піліп зноў зайграў, і пчолы вярнуліся. Трэці раз князь купіў у Піліпа пчол і трэці раз пакаштаваў іх мёд, а той аказаўся цёмны, як гнілыя ягады, і кіслы, як твар нялюбага.

Зноў зайграў Піліп на гліняным свістку. Пчолы падняліся і закруцілі ўраганам вакол палаца. Так шмат іх было, што нават святло засланілі. Лёталі яны так хутка, што вецер ад іх руху паваліў адно дрэва. Гулі яны так гучна, што тры ці чатыры мужыкі нават аглухлі. Джалілі пчолы мужыкоў і іх баб, князя, яго жонку і дзяцей, пасля чаго іх целы гарэлі грэцкім агнём і надзіміліся, як пупышкі на дрэвах.

Так Піліп узбагаціўся, а князь з тых часоў не купляў пчол, а плаціў яму толькі за мёд, але цяпер у пяць разоў даражэй.

SEX-БАЛЯСЫ

# ВУСНЫ Д'ЯБЛА

**Вы яшчэ не чулі пра гэты новы модны трэнд у сучаснай касметалогіі? Ну, лічыце, тады вам пашчасціла. Пакуль... Бо давядзецца пазнаёміць, не можаце вы такое прапусціць. («— А праўда, што цябе жонка б'е патэльняй па твары? — Ну і што! Затое блінчыкі на мяне падобныя!») Выглядае ён сапраўды даволі жудасна. («Зрабіць з пчальніка кантактны заапарк было далёка не самай лепшай ідэяй».) Сутнасць трэнда ў тым, каб не проста павялічыць вусны да ненатуральных памераў, але яшчэ і змяніць іх форму. «Модніцы» сталі рабіць хвалю на верхняй губе — такі варыянт называецца «медуза», «васьміног» ці тыя самыя згаданыя «вусны д'ябла». Дамагаюцца жаданага эфекту з дапамогай прэпаратаў, якія ўводзяць побач з краем вуснаў, тым самым змяняючы іх контур. Зрабіць гэта можна, толькі ці вернецца ім потым звыклая форма — тое яшчэ пытанне. У касметалогіі круцяцца вялікія грошы, праўду ніхто гаварыць не будзе. («— Доктар, у мяне ў галаве маленькі чалавечак увесь час лаецца мацюкамі! — Дык гэта лёгка паправіць! Тысяча долараў і ніякіх праблем! — Доктар, а вы ведаеце, што зараз сказаў маленькі чалавечак?!») Таму хоць ахвотных абзавесціся «вуснамі д'ябла» хапае, на шчасце, шмат і тых, хто паставіўся да трэнду крайне негатыўна.**

А то вы ж ведаеце, дрэнны прыклад — заразлівы. Добра, калі ён проста бяскрыўдны. Напрыклад, як флэшмоб з Азіі, вядомай сваімі дзіўнымі трэндамі. («Дырэктар цырка, гледзячы на выступленне п'янага жанглёра-эквілібрыста, сказаў, што выступаць пасля яго клоўнам, — толькі зняславіцца».) Цягам некалькіх гадоў адтуль да заходнееўрапейцаў дайшла забаўка пад назвай «рыбка ў ключыцы». Гэта калі дзяўчаты наліваюць у сваю ключычную ямку ваду і запускаюць туды марскіх жыхароў (некаторыя пачалі замяняць іх манеткамі). Мэта — прадэманстраваць сваю крохкасць, стройнасць, зграбнасць. Ну, дык у гэтым рэгіёне жаночая худоба асабліва цэніцца здаўна. («Дзяўчына, якая абяцала не есці пасля шасці, апоўначы выпіла катлету».) Клімат, ведаеце, рыбкі пад рукой... Бывае значна горш.

Нядаўна ў сеціве з'явіліся шакіруючыя фота блогеркі з Навасібірска Кацярыны Андрэевай. Дзяўчыне 21 год, тым не менш яна падобная на падлетка. Карыстальніца выкладвае здымкі, на якіх выглядае ненатуральна худой. Яе ногі-саломінкі, рукі-нітачкі і асіная талія ў большасці падпісчыкаў выклікаюць не захапленне, а трывогу. У сеціве пішуць, што блогерку, якая бравіруе сваімі касцямі, хочацца тэрмінова накарміць булачкамі са згушчонкай. Тая ж не прызнаецца ў анарэксіі, наадварот, кажа, што, маўляў, нават крыху паправілася, але сваю вагу не называе. І эпаціруе іншых... досыць адкрытымі вобразамі. Гэта ў яе фізічнай форме... («Шэранькі ваўчок у 2019-м: узломвае твой фітнес-бранзалет, каб даведацца ўсё пра твае фазы сну і знайсці ідэальны момант для кусання за бачок».) Добра, хоць іншых не заклікае рабіць тое ж самае.

А вось дзе вусны д'ябла раскрыліся напоўніцу, дык гэта ў сітуацыі з Грэтай Тунберг. Яе яшчэ часопіс Time днямі назваў чалавекам года. Ведаеце такую? («Здаецца, што ў апошні час усіх нованароджаных дзяўчынак называюць у гонар якой-небудзь цырульні».) Пішуць, што тая разам з паплечніцай скінула маску экалагічнай актывісткі і цвёрда акрэсліла свае рэальныя палітычныя мэты. Дзяўчаты прызналіся, што іх барацьба за «выратаванне планеты» патрабуе знішчэння існуючай палітычнай і эканамічнай сістэмы. Маўляў, экалагічны крызіс датычыцца не толькі навакольнага асяроддзя. Гэта крызіс правоў чалавека, справядлівасці і палітычнай волі, якія стварылі і падсілкавалі «каланіяльная, расісцкая і патрыярхальная сістэмы прыгнёту». («— Мама, чаму браціка бусел прынёс, а мяне ў капусце знайшлі? — Упусціў цябе бусел...») Цяпер увага: што хаваецца за спецыфічнай мовай радыкальных «зялёных»? Тыя самыя вусны д'ябла... У іх паняцці «патрыярхальная сістэма прыгнёту» — любое грамадства з традыцыйнымі каштоўнасцямі, у якіх мужчына — гэта мужчына, а жанчына — гэта жанчына. А сям'я — саюз паміж імі, у якім выхоўваюцца дзеці. Як вам? («— Ты ясі як мужык. Па маіх падліках, ты павінна важыць 150 кілаграмаў, але ў табе ўтрая менш. У чым сакрэт? — Высокі ўзровень метабалізму, інтэнсіўная работа нейронаў, пастаянныя выкіды адрэналіну ў кроў ну і, вядома, паскораны цыкл Крэбса. — Ведзьма? — Ведзьма.») І так, гэтыя так званыя экалагічныя актывісты выступаюць з заклікам устрымацца ад нараджэння дзяцей — таксама ў імя выратавання клімату. Прычым сярод моладзі ў англасаксонскіх краінах, дзе такая прапаганда працуе на поўную моц, згаданыя погляды становяцца ўсё больш папулярныя.

Ды што там... Нядаўна спецыялісты адзначылі, што сярод расіян ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў з'явілася тэндэнцыя — свядомая адмова ад сексу. Пра гэта СМІ расказала намеснік старшыні Усерасійскай асацыяцыі сексолагаў па сацыяльных пытаннях Іна Сарока. Тэндэнцыя намецілася некалькі гадоў таму. Яе прыхільнікаў называюць асексуаламі. («— Прывітанне. Як наконт сексу? — Паспрабуй. Кажуць, нармальная справа. — А ты згодная ці не? — Канешне, займайся ў сваё задавальненне. — З табой. — Са мной усё добра. Сам як?») Іх дэвіз: «няма сексу — няма праблем». Але ж ці павінна так быць?.. («Аб'ява: «Мяняю двухмесную палатку на дзіцячую каляску. Палатка зусім новая, выкарыстоўвалася адзін раз».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Сваім 54-м памерам цалкам задаволеная!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Якія патрабаванні прад'яўляюць да мадэляў plus size?***

— Наогул яны да нас і «стандартных» у чымсьці падобныя. Рост павінен быць ад 170 сантыметраў. Постаць абавязкова ў форме пясочнага гадзінніка, каб добра была відаць талія. Вядома ж, мілавідны твар, каб на ім не было ніякіх бачных дэфектаў. Таксама рэдка сустрэнеш мадэль з круглым тварам. Адна з пераваг перад стандартнымі мадэлямі — гэта тое, што ў нас няма дакладных параметраў, а дзяўчаты дзеляцца па памерах адзення. Мадэль памеру «плюс» пачынаецца з 46-га. Мой памер 54-ы, і я ім цалкам задаволеная *(смяецца)*!

**«Людзі яшчэ не гатовыя да такіх перамен, для іх тое, што нестандартна, прыраўноўваецца да няправільнага».**

***— У вас ніколі не было жадання схуднець да «стандартаў»?***

— Думаю, многія здзівяцца, але не! Я заўсёды была трохі больш паўнаватая за сваіх аднагодкаў. Але асаблівых праблем гэта ніколі не выклікала. Калі вучылася ў школе, была памеры на два больш за аднакласніц, але мне тое не замінала. Вядома, равеснікі спачатку спрабавалі зачапіць, дражніць, але потым убачылі, што я проста не звяртаю на гэта ўвагі, і адчапіліся. А вось думкі кінуць мадэльную кар'еру пару разоў узнікалі. Часам проста стамляешся ад нагрузкі: пастаянныя прымеркі, шматгадзінныя фотасесіі... Мая самая доўгая працягвалася цэлыя суткі! Прычым гэта не значыць, што ты ўсе 24 гадзіны здымаешся. Бывае такое, што з табой у праекце ўдзельнічае яшчэ дзяўчат пяць-шэсць. І пакуль іх фатаграфуюць, ты павінна проста роўненька стаяць, каб не пакамечыць адзенне, не сапсаваць прычоску, макіяж, а потым пасля ўсяго гэтага ідзеш і робіш свае кадры! Аднак пасля трохі адпачываеш, і зноў хочацца здымацца.

***— Але ж у мадэлі plus size канкурэнцыя меншая, чым сярод «стандартных»?***

— Тут наогул цяжка гаварыць пра якую-небудзь канкурэнцыю. Запатрабаваных мадэляў, якія б рэкламавалі сапраўды вядомыя брэнды і працавалі пастаянна ў гэтым кірунку, можна палічыць па пальцах. Адна з прычын у тым, што няма падрадчыкаў, з якімі магла б працаваць дзяўчына памеру «плюс». Калі б попыт на рэкламу быў вялікі, то такіх мадэляў, як я, было б столькі ж, колькі і звычайных. Другая прычына, на мой погляд, — гэта тое, што ў краіне няма спецыяльнай школы прыгажосці. З нашай фігурай часам нават больш складана, чым са звычайнай. Ну а па-трэцяе, людзі яшчэ не гатовыя да такіх перамен, для іх тое, што нестандартна, прыраўноўваецца да няправільнага. Спадзяюся, у хуткім часе сітуацыя палепшыцца і, можа, калі-небудзь мадэль памеру «плюс» будзе прадстаўляць Беларусь на «Міс Свету».

***— Мадэлінг для вас работа ці ўсё ж хобі?***

— З адукацыі я юрыст і працую па спецыяльнасці. Мадэлінг для мяне — гэта аплатнае хобі. Па сваёй натуры я хатні чалавек: ненармаваны графік і пастаянныя раз'езды — гэта дакладна не пра мяне. І так часам бывае складана сумяшчаць работу юрыста і мадэлі. Ад таго, што большасць здымак праходзіць у буднія дні і ў першай палове дня, а заказчыку не асабліва цікава, што ў цябе ёсць работа, акрамя фотасесій.

***— Што для вас самае складанае і самае прыемнае ў рабоце мадэлі?***

— Абцасы! *(Смяецца.)* Раней я на іх увесь час хадзіла, магла нават бегаць, але ногі моцна стамляюцца, і цяпер я стараюся насіць абутак на нізкай падэшве. А самае прыемнае — гэта, вядома ж, прыгожыя фатаграфіі! Дзяўчаты могуць месяцамі рабіць іх, каб выбраць найлепшую і выставіць у сацыяльныя сеткі. А ў мяне адна фотасесія — і выбірай амаль любую! *(Смяецца.)*

***— Заставацца стыльнай для мадэлі важна заўсёды. Ці дазваляе выбар у беларускіх крамах знаходзіць прыгожыя рэчы вашага памеру?***

— Гэта мая балючая тэма! Ён у мас-маркетах для поўных дзяўчат проста нікчэмна малы! Самая вялікая цяжкасць у тым, што большасць вытворцаў лічаць: калі ў цябе больш за 50-ы памер, значыць табе павінна быць гадоў за 40. Такія рэчы і купляюць названага ўзросту жанчыны, а ў іх не такі густ, як у мяне ў 26. Калі прыходжу ў краму, не чапляюся да колеру або фасону, мне галоўнае, каб добра сядзела і выглядала маладзёжна, але знайсці такую рэч вельмі цяжка. Часам магу шукаць, напрыклад, куртку пару месяцаў і не знайсці. А ездзіць за мяжу або замаўляць адзенне на заказ вельмі накладна і нязручна.

***— Калі б у вас была магчымасць рэкламаваць любы брэнд, то які выбралі б?***

— Хутчэй за ўсё касметыку. Любая дзяўчына карыстаецца ёй. Я не супраць натуральнасці, але з дапамогай касметыкі можна падкрэсліць усё тое, што табе дала прырода. Калі шчыра, я раней не дужа ўмела фарбавацца, таму пайшла на курсы па макіяжы і цяпер заўсёды ўпэўнена, што выглядаю шыкоўна *(смяецца)*! Ну і яшчэ біжутэрыю — стыльныя аксэсуары не бываюць лішнія.

***— Вы часта чуеце крытыку ў свой адрас?***

— Уся мая работа рана ці позна з'яўляецца ў інтэрнэце, і большасць каментарыяў негатыўныя. Раней прымала гэта вельмі блізка да сэрца і засмучалася. Але з часам зразумела, што, калі б я была такая жудасная, як пішуць, то мяне б не клікалі на здымкі і розныя праекты. Я развіваюся, раблюся лепшай, а людзі, якія пакінулі негатыўныя водгукі, гэтак жа сядзяць і працягваюць іх пісаць. І я проста перастала звяртаць увагу. Я такая, якая ёсць, і мне гэта падабаецца! Да таго ж бачу, як падтрымліваюць мяне мае сябры і ганарацца бацькі. Тата заўсёды, калі бачыць мяне на нейкай вокладцы, хваліцца мной і паказвае ўсім *(смяецца)*.

***— Як лічыце, у прыгажосці ёсць нейкія стандарты?***

— Кожная дзяўчына прыгожая па-свойму! Я прытрымліваюся бодзі-пазіціву, які тлумачыць, што ўсе нашы «недахопы» — гэта асаблівасці. Вядома, павінны выконвацца банальныя правілы гігіены і акуратнасці. А ў астатнім прыгажосць ніколі не мела межаў, гэта людзі самі сабе іх ствараюць!

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**
**Фота з архіва гераіні.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 18.12.2019 г.

# «Краязнаўства — справа кожнага»

## Найлепшы вынік — рэалізаваныя праекты

***— Тадэвуш Іванавіч, якія знакавыя праекты Беларускага фонду культуры вы б вылучылі?***

— З першых гадоў існавання БФК ініцыяваў і пачаў рэалізацыю доўгатэрміновых навукова-даследчых і выдавецкіх праектаў «Спадчына» і «Вяртанне» (было выдадзена сем выпускаў), на базе якіх пазней былі распрацаваны рэспубліканскія праграмы. У 1998 годзе распачаты праект «Славутыя імёны Беларусі» (выдадзены зборнікі ў двух тамах), дзякуючы якому былі вернуты ў навуковы і грамадска-культурны кантэкст дзясяткі сусветна вядомых, але забытых на сваёй радзіме выхадцаў з Беларусі. На працягу 2015—2017 гадоў па ініцыятыве нашага фонду быў рэалізаваны праект «Адновім Будслаўскую святыню разам» (яго падтрымалі Міністэрства культуры і Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч) па зборы грамадскіх сродкаў на навуковае даследаванне і рэстаўрацыю ўнікальнага драўлянага алтара XVII стагоддзя, абраза святой заступніцы Беларусі Маці Божай Будслаўскай, насценных роспісаў, аднаўленне аргана. Таксама з ініцыятывы БФК была распачата праца па ўнясенні ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА Будслаўскага фэсту, у выніку чаго ў лістападзе 2018 года гэтае мерапрыемства ўвайшло ў рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

***— Калі казаць пра дзейнасць дня сённяшняга, то, мабыць, таксама ёсць адметныя моманты?***

— Наша арганізацыя бярэ ўдзел у доўгатэрміновым праекце Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі «Рэгіён на гісторыка-культурнай карце Беларусі». Рэспубліканскія навукова-практычныя семінары і канферэнцыі праведзены ў 2017—2019 гадах у Пастаўскім, Любанскім, Іванаўскім і Слонімскім раёнах. Таксама БФК ініцыюе і бярэ ўдзел у рэалізацыі праектаў і мерапрыемстваў, прысвечаных важным падзеям і юбілеям славутых дзеячаў гісторыі і культуры Беларусі. Напрыклад, да 220-годдзя Адама Міцкевіча летась быў рэалізаваны сумесна з Польскім інстытутам у Мінску, пасольствам Літвы ў Беларусі і іншымі зацікаўленымі праект «Чытаем Міцкевіча разам». Сёлета праводзілі мерапрыемствы з нагоды 200-годдзя з дня нараджэння С. Манюшкі. Таксама на працягу апошніх двух гадоў рэалізуем праект «Мой род — мая радзіма», у рамках якога ў Мінску адбываецца прэзентацыя краязнаўчай літаратуры, выдадзенай у рэгіёнах Беларусі, а таксама сустрэчы з мясцовымі краязнаўцамі, дзеячамі культуры.

## Вопыт і праблемы

***— Ведаю, што ў лютым наступнага года пройдзе I Краязнаўчы форум. Якія спадзяванні і планы ў вас адносна яго?***

— Краязнаўчы форум з'яўляецца важным праектам, скіраваным на падтрымку і актывізацыю краязнаўчай дзейнасці, які мы будзем праводзіць сумесна з Нацыянальным гістарычным музеем, — ён узяў на сябе асноўную ролю па арганізацыі. І мы, безумоўна, вернемся да праблемы, якую калісьці спрабавалі вырашыць, — стварэнне рэспубліканскага Краязнаўчага таварыства. Таму што, на жаль, на сёння такога таварыства няма, а неабходнасць у ім існуе. Бо кожны краязнавец мясцовага аб'яднання працуе у сваім асяроддзі, а вось наяўнасць і дзейнасць рэспубліканскага Краязнаўчага таварыства акумулявала б найлепшы вопыт і рыхтавала б нейкія метадычныя распрацоўкі, аказвала б канкрэтную дапамогу, каб краязнаўчы рух шырыўся. На форуме таксама будзе праведзены конкурс новых краязнаўчых праектаў з мэтай адзначыць найлепшых і стымуляваць іншых. Прадставім найбольш цікавыя праекты, якія ўжо рэалізаваны. Напрыклад, у час форуму плануецца прэзентацыя дзейнасці краязнаўцаў Пастаўшчыны: у іх назапашаны багаты вопыт, створана інфармацыйная база па розных кірунках краязнаўчай дзейнасці і выдадзена многа кніг. Хочацца, каб гэты вопыт быў даступны і для іншых. Сёння ў многіх раёнах ёсць розныя кірункі краязнаўчай дзейнасці, але, на жаль, практычна адзінае выданне, якое займаецца папулярызацыяй такой дзейнасці, — гэта «Краязнаўчая газета». Мы маем невялікі тыраж і невялікае кола чытачоў, таму зноў жа на форуме зможам зрабіць прэзентацыю нашага выдання. Увогуле задача Краязнаўчага форума — падсумаваць той назапашаны вопыт, які ўжо ёсць. За апошнія гады краязнаўчая дзейнасць значна пашырылася, у тым ліку і ў сувязі з аб'яўленнем Года малой радзімы з'явіўся шэраг цікавых мясцовых праектаў. Безумоўна, ёсць перспектывы для далейшага развіцця. У кожным раёне існуюць магчымасці арганізацыі шырокай краязнаўчай дзейнасці па аднаўленні мясцовай гісторыі, славутых асоб, якія нарадзіліся і выйшлі з гэтага раёна, па стварэнні музейных куткоў, па напісанні летапісу і шмат па чым іншым.

***— Вы згадалі «Краязнаўчую газету», яна існуе ўжо 16 гадоў. Якія праблемы мае спецыялізаванае выданне і як вы пераадольваеце іх?***

— Галоўная праблема, якая сёння стаіць перад намі, — захаваць газету, бо зараз яна трымаецца толькі на энтузіязме работнікаў Фонда культуры, якія практычна на грамадскіх пачатках яе рыхтуюць. Зразумела, сёння гэта праблема не толькі «Краязнаўчай газеты», але і іншых друкаваных СМІ. З укараненнем інтэрнэту цікавасць да друкаванага слова, як і да кніжак, знізілася. Для нас самае галоўнае — газету захаваць, таму што калі яна будзе заўтра страчана, то пасля, напэўна, ужо не будзе адноўлена. Безумоўна, важна пашырыць яе тыраж, бо гэта адзіная гарантыя захавання выдання. Патэнцыял для пашырэння тыражу мы маем. Глядзіце, сёння ў Беларусі працуе 2,5 тысячы дзяржаўных бібліятэк. Лагічна, што газета там павінна быць, хоць бы ў раённых, гарадскіх і асноўных сельскіх, бо гэта дакументы, якія захоўваюцца, і потым даследчыкі, мясцовыя жыхары могуць пры неабходнасці звярнуцца да іх, каб атрымаць нейкія дадатковыя матэрыялы. Тут і школьныя, краязнаўчыя музеі, якіх сёння больш за 1,5 тысячы. І там газета патрэбная. Плюс людзі адтуль могуць актыўна пісаць нам пра свае дасягненні і папулярызаваць свой вопыт. А што датычыцца зместу газеты, то, безумоўна, яна павінна ўдасканальвацца. Яшчэ адна наша праблема сёння — што мы не маем штатных карэспандэнтаў.

## Захаванне самабытнасці

***— А хочацца мець магчымасць новага погляду і глыбокага звароту да тэмы?***

— У асноўным карыстаемся матэрыяламі, якія нам дасылаюць чытачы і падпісчыкі. Але ў той жа час ставім перад сабой задачу, каб мэтава рыхтаваць важныя, праблемныя матэрыялы. Умоўна: мы дамаўляемся з вядомым гісторыкам альбо краязнаўцам, які рыхтуе матэрыял для газеты. І такіх тэм, праблем больш чым дастаткова. Напрыклад, праблема знікаючых помнікаў. Яна актуальная для кожнага раёна і для Беларусі ў цэлым, бо часта ад недасведчанасці і абыякавасці разбураюцца рэшткі такіх помнікаў. А калі мы ў газеце згадаем іх і інфармацыя дойдзе да мясцовых улад, то гэта таксама будзе іх стымуляваць і падштурхоўваць да захавання таго, што ёсць. Як і для мясцовых, хто разбурае, разносіць усё ад няведання. Альбо яшчэ адзін прыклад: вадзяныя млыны. У нас іх было звыш сотні ў Беларусі, і млыны выконвалі не толькі чыста ўтылітарную функцыю, у іх малолі збожжа, выраблялі валёнкі... Млыны — цікавыя аб'екты, яны былі сведчаннем заможнасці, і ў іх прыгожая архітэктура будынкаў. Яны з'яўляліся месцам сустрэч людзей. Сёння, па нашых звестках, у Беларусі захавалася звыш 70 вадзяных млыноў, аднак толькі адзінкі з іх працуюць. А ў прынцыпе, калі мы гаворым цяпер пра экалагічныя праблемы, пра аднаўленне энергіі, то млыны могуць быць запатрабаваныя. Іх можна задзейнічаць у тым ліку і як турыстычныя аб'екты. Прыклад млына ў Жодзішках Смаргонскага раёна паказвае, што сёння там людзі могуць змалоць муку. Гэта сапраўдны інтэрактыўны музей, дзе відаць кожны этап — ад зерня да мукі і свежаспечанага хлеба. Сёння моладзь, я ўпэўнены, ужо не ведае тых традыцый, тых працэсаў. А гэта вельмі важны фактар выхавання.

***— Калі казаць пра папулярызацыю краязнаўства сярод моладзі, то што тут спрацоўвае?***

— У краязнаўстве многа моладзі, асабліва школьнікаў. І рэспубліканскі конкурс «Славутыя імёны малой радзімы» гэта пацвердзіў. А калі арыентавацца на тое, што ў краіне на базе школ дзейнічае звыш тысячы школьных, краязнаўчых, гістарычных музеяў, то нават гэта сведчыць пра перспектывы развіцця краязнаўчай дзейнасці. У нас ёсць прыклады зацікаўленасці моладзі пры рэалізацыі нашых праектаў. У свой час Беларускі фонд культуры з'яўляўся адным з арганізатараў Фэста экскурсаводаў, які сёлета прайшоў ужо дзясяты раз. З кожным годам яго геаграфія пашыраецца, да яго далучаюцца новыя людзі, якія па сваёй ініцыятыве распрацоўваюць цікавыя маршруты. Калі раней гэты фэст праводзіўся толькі ў Мінску, то сёння праходзіць ужо практычна ва ўсіх рэгіёнах. І людзі, якія цікавяцца, умоўна кажучы, гісторыяй свайго горада, нейкімі памятнымі мясцінамі, мэтава вывучаюць пэўныя аб'екты і рыхтуюць экскурсіі. І калі малады чалавек даследуе нейкую праблему і на аснове здабытага матэрыялу рыхтуе цікавы маршрут, то потым збірае вакол сябе людзей, якім гэта таксама цікава. Вось такія нефармальныя зносіны пашыраюць зацікаўленасць... Ці сітуацыя з мясцовым унутраным турызмам. Ён у нас яшчэ не атрымаў такога шырокага распаўсюджання, як, напрыклад, у Польшчы, дзе ўжо ёсць традыцыя праводзіць выхадныя ў актыўных падарожжах па краіне. У нас гэта толькі пачынае развівацца. А мы ў свой час, калі пасля рэстаўрацыі адкрывалася экспазіцыя Мірскага замка, Нясвіжскага палаца, гаварылі, што гэтыя аб'екты павінен наведаць кожны беларус. Зразумела, што не кожнаму тое ўдалося, але такую мэту трэба ставіць. Такія цікавыя аб'екты ёсць у кожным раёне, іх трэба ведаць. Краязнаўцы могуць стымуляваць гэты рух, прапануючы ўнікальныя, малавядомыя альбо наогул невядомыя аб'екты, маршруты. Таму тут таксама краязнаўчая дзейнасць мае і канкрэтныя задачы, і прыкладны характар. Бо такім чынам можна не толькі вывучыць сваю краіну, малую радзіму, але і падтрымаць выхаваўчы патрыятычны рух. Краязнаўчы рух — не прыватная справа, таму мы і гаворым, што павінны быць створаны грамадскія, а можа, у перспектыве і дзяржаўныя інстытуты, якія б стымулявалі і каардынавалі яго. Тады мы будзем узбагачаць гісторыю і культуру нашай краіны, прывіваць любоў да яе, фарміруючы сваю самабытнасць.

**Алена ДРАПКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**сообщает о проведении открытого аукциона 21.01.2020**

**Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 700/С-15723 – здание ресторана «Санта-Мария»,** площадь – 386,5 кв. м, назначение: здание специализированное для общественного питания, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, 69Г. Составные части и принадлежности: двухэтажное каменное здание ресторана «Санта – Мария» с двумя ограждениями, двумя воротами, мусорной площадкой, ограждением мусорной площадки, навесом, складом замороженных продуктов, складом инвентаря, двумя мощениями.
Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000005000429 (право постоянного пользования), площадь – 0,2421 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания ресторана, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, 69г. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: ограничения (обременения), устанавливаемые в отношении недвижимого имущества, находящегося в прибрежной полосе водоема, площадь 0.1573 га.
**Начальная цена продажи: 704 952,00 бел. рублей с учетом НДС (20 %). Сумма задатка: 70 495,20 белорусского рубля**

**Аукцион состоится 21 января 2020 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок (осуществляется лично) и внесения задатка: 20 января 2020 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Универмаг «Центральный», УНП 700002659, г. Могилев, ул. Первомайская, 61, тел. 22-06-63

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,
р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно лично подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым в день проведения аукциона счетом-фактурой. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли – продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by, на сайте ino.by**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф.46 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотов, расположенные по адресу: Витебская обл., Дубровенский р-н, Малобаховский с/с , 4, 1.9 км севернее д. Свиряки, в следующем составе:**

**Башня водонапорная** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер 241/С-7052, составные части и принадлежности: резервуар бак, ствол, технологический колодец. **Башня водонапорная** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер 241/С-7054, составные части и принадлежности: резервуар бак, ствол. **Дорога асфальтобетонная** (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 241/С-7053. **Эстрада** (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), 241/С-7055. **Бассейн** (сооружение специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения), инв. номер 241/С-7056. **Уборная** (здание специализированное иного назначения), инв. номер 241/С-7057, общ. пл. 25,5 кв. м. **Овощехранилище** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 241/С-7058, общ. пл. 35 кв. м, составные части и принадлежности: сход.
**Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 241/С-7059, общ. пл. 38,1 кв. м. **Кладовая** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), 241/С-7060, общ. пл. 30,3 кв. м. **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 241/С-7061, общ. пл. 101,2 кв. м. **Прачечная** (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. номер 241/С-7062, 18,9 кв. м. **Столовая** (здание специализированное для общественного питания), инв. номер 241/С-7063, общ. пл. 591,3 кв. м, составные части и принадлежности: три пристройки, навес. **Подсобные помещения** (здание специализированное иного назначения), инв. номер 241/С-7064, общ. пл. 11,1 кв. м. **Здание насосной** (здание специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 241/С-7065, общ. пл. 18,5 кв. м. **Здание насосной** (здание специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 241/С-7066, общ. пл.16,6 кв. м. **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 241/С-7067, общ. пл. 92,9 кв. м. **Баня** (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. номер 241/С-7068, общ. пл. 93,3 кв. м

**Сведения о земельном участке:** земельный участок с кадастровым номером 222482900001000003, общ. пл. 2,8148 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений пионерского лагеря «Дружба» (участок № 1).
**Ограничения (обременения) прав.** Водоохранная зона водного объекта: река Днепр, площадь 1,5907 га; ручей Табора, площадь 0,7600 га; ручей Табора, площадь 0,3695 га. Прибрежная полоса водного объекта: река Днепр, площадь 0,0946 га. Придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, площадь 0,1000 га. Охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадь 0,0330 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **83 067,54 белорусского рубля** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 30 (тридцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета аукциона**

**Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи**

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов**

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 07.12.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов 11.00 31.12.2019 г.<br>Окончание торгов 12.00 31.12.2019 г.<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.12.2019 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06**<br>**E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

# СТРАТЭГІЧНА ВАЖНЫ СЕКТАР ЭКАНОМІКІ

**Паважаныя калегі, работнікі і ветэраны энергетычнай галіны!**

Прыміце шчырыя віншаванні ад імя Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь і ад мяне асабіста з прафесійным святам — Днём энергетыка!

Энергетычны комплекс Рэспублікі Беларусь — стратэгічна важны сектар эканомікі, дзейнасць якога накіравана на забеспячэнне эканамічнай бяспекі і незалежнасці нашай краіны, дабрабыту і камфорту беларускіх грамадзян.

Дзякуючы кругласутачнай нялёгкай і адказнай працы работнікаў галіны спажыўцы рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва атрымліваюць у неабходных аб'ёмах электрычную і цеплавую энергію, прыродны газ, тарфяное паліва.

2019 год азнаменаваўся пазітыўнымі для айчыннай энергетыкі зменамі. Вынікам работы арганізацый Мінэнерга стала павелічэнне спажывання электрычнай энергіі ў краіне, рост экспартных паставак. Зніжаны цэны на прыродны газ і тарыфы на электраэнергію для рэальнага сектара эканомікі, што стала важкім унёскам энергетыкаў у павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў.

На сістэмнай аснове працягваецца работа па павышэнні эфектыўнасці функцыянавання энергетычнага абсталявання і надзейнасці энергазабеспячэння. Беларускія энергетыкі паспяхова завяршылі рэканструкцыю турбаагрэгата Гродзенскай ЦЭЦ-2, падстанцыі 330 кВ «Мінск-Паўночная», будаўніцтва падстанцыі 330 кВ «Металургічная», значна абнавілі інфраструктуру электрычных і цеплавых сетак.

Актыўна праводзіцца работа па будаўніцтве электракатлоў і пікавараэрвовых крыніц на аб'ектах энергазабеспячэння ў рамках інтэграцыі Беларускай атамнай электрастанцыі ў энергасістэму краіны.

Наступны год запатрабуе ад нас такой жа адказнай і добрасумленнай працы, высокай кваліфікацыі, гатоўнасці да прымянення перадавых тэхналогій і сучасных падыходаў у вырашэнні ключавых задач. Сярод іх — пуск Беларускай АЭС, далейшая мадэрнізацыя электрычных і цеплавых сетак, павышэнне энергаэфектыўнасці, удасканаленне збытавай дзейнасці.

Асаблівую падзяку хачу выказаць ветэранам галіны, чыя спадчына ляжыць у аснове паспяховага развіцця энергетыкі. Ваш бясцэнны вопыт сёння дапамагае маладому пакаленню энергетыкаў авалодваць прафесійнымі ведамі, удасканальваць майстэрства, захоўваць і памнажаць нашы працоўныя традыцыі.

Віншую кіраўнікоў і спецыялістаў арганізацый, якія ўваходзяць у сістэму Міністэрства энергетыкі, усіх, хто забяспечвае надзейнае функцыянаванне энергетычнай галіны. Ваша праца — значны ўнёсак у развіццё і ўмацаванне эканомікі Рэспублікі Беларусь.

Жадаю вам, паважаныя калегі, прафесійных дасягненняў, невычэрпнай энергіі, моцнага здароўя, дабрабыту і шчаслівага Новага года!

**Віктар КАРАНКЕВІЧ,**
**міністр энергетыкі**
**Рэспублікі Беларусь.**

**Панарама Беларускай АЭС.**

# ЭНЕРГАСІСТЭМА КРАІНЫ НА ПАРОЗЕ НОВАЙ ЭРЫ

**Дарагія сябры, паважаныя калегі!**

Дзяржаўнае вытворчае аб'яднанне электраэнергетыкі «Белэнерга» сардэчна віншуе работнікаў і ветэранаў Беларускай энергасістэмы з прафесійным святам — Днём энергетыка!

У сучасным грамадстве энергія і цяпло ўспрымаюцца як звычайныя выгоды. Мала каму відаць тая праца, якую выконваюць тысячы і тысячы энергетыкаў па ўсёй краіне з дня ў дзень. Але мы з вамі выдатна ведаем, чаго варта выпрацаваць і даставіць да спажыўца электраэнергію ці цяпло. Работа ў энергетыцы накладвае асаблівую адказнасць на спецыялістаў галіны, патрабуе найстражэйшай дысцыпліны і аператыўнай гатоўнасці. Для энергетыкаў няма выхадных і святочных дзён — штодня, днём і ноччу, зімой і летам энергетыкі забяспечваюць бесперабойнае і надзейнае энергазабеспячэнне аб'ектаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сацыяльнай сферы, нясуць адказнасць за тое, каб у кожным беларускім доме былі святло і цяпло.

Наша свята — гэта магчымасць падвесці вынікі зробленага за год, ацаніць дасягнутае і вызначыць мэты і задачы на будучыню. Мы стаім на парозе новай эры ў гісторыі айчыннай энергетыкі. Сімвалічна, што налета, калі мы будзем адзначаць 100-гадовы юбілей Плана ГОЭЛРО, у энергетычную сістэму Беларусі ўліваецца самая магутная энергакрыніца — Беларуская АЭС. Ужо шмат зроблена, каб гэты грандыёзны для краіны праект быў паспяхова ўвасоблены ў жыццё. Завершана рэалізацыя мерапрыемстваў па выдачы магутнасці. Гэта вельмі значная падзея, якая дазволіць забяспечыць пастаўку электрычнай энергіі ў любы рэгіён краіны. Працягваюцца работы па рэжымнай інтэграцыі БелАЭС у баланс энергасістэмы, на цеплавых электрычных станцыях будуць устаноўлены электракатлы, а на чатырох буйных станцыях пабудаваны пікава-рэзервовыя энергакрыніцы.

**Калі справа па душы.**

Не забываем мы і пра нашу паўсядзённую працу: пастаянна праводзіцца абнаўленне асноўных вытворчых фондаў, павышаецца эфектыўнасць работы энергетычнага абсталявання, паспяхова праведзена рамонтная кампанія, пабудаваны і адрамантаваны тысячы кіламетраў ліній электраперадачы і сотні кіламетраў цеплавых сетак, пабудаваны і рэканструяваны высакавольтныя падстанцыі, адкрыты новыя цэнтры абслугоўвання спажыўцоў.

**Работа на вышыні патрабуе асаблівага майстэрства.**

Вырашэнне гэтых і не толькі гэтых задач пацвердзіла, што ключавым рэсурсам энергасістэмы з'яўляюцца людзі. Любы новы праект — гэта выклік, які можна вырашыць шляхам мабілізацыі сіл і пошуку новых рашэнняў. І за тое, што сёння энергасістэма працуе надзейна і зладжана, я шчыра дзякую менавіта вам — працаўнікам энергасістэмы — за стойкасць, упартасць і прафесіяналізм. Усе мы — энергетыкі, мы выбралі гэты шлях і з годнасцю ідзём па ім і будзем рабіць гэта і надалей.

Асаблівыя словы павагі хачу адрасаваць нашым ветэранам. Ваша адданасць служэнню справе, закладзеная ў працоўныя традыцыі, — гэта аснова і падмурак для далейшага развіцця энергасістэмы наступнымі пакаленнямі энергетыкаў.

Усяму калектыву нашага аб'яднання жадаю далейшых вытворчых дасягненняў, паспяховай рэалізацыі маштабных праектаў, надзейнай і безаварыйнай працы. Хай у надыходзячым годзе ў нас будуць новыя падставы для гонару, новыя высокія вынікі ў працы, новыя пачынанні і яркія перамогі. Прыміце самыя шчырыя пажаданні здароўя, дабрабыту і невычэрпнай жыццёвай энергіі! Са святам!

**Павел ДРОЗД,**
**генеральны дырэктар**
**ДВА «Белэнерга».**

# «БЕЛЭНЕРГА»: МОВАЙ СТАТЫСТЫКІ

Устаноўленая магутнасць генеруючых крыніц, якія ўваходзяць у склад ДВА «Белэнерга», складае 8938,34 МВт (па стане на 1 студзеня 2019 года).

Асноўная задача — забеспячэнне надзейнай і ўстойлівай пастаўкі спажыўцам цеплавой і электрычнай энергіі ў запатрабаваных аб'ёмах — сёлета выканана.

Выпрацоўка электраэнергіі энергакрыніцамі ДВА «Белэнерга» за 2019 год ацэньваецца на ўзроўні 35,8 млрд кВт.г, што на 2,8 % вышэй за ўзровень мінулага года. Водпуск цеплавой энергіі ад цеплакрыніц энергазабеспячальных арганізацый за 2019 год чакаецца ў аб'ёме 33,0 млн Гкал.

Спажыванне электраэнергіі ў краіне ў 2019 годзе было забяспечана ўласнай выпрацоўкай, імпарт электраэнергіі практычна не ажыццяўляўся.

Экспарт электраэнергіі сёлета чакаецца ў аб'ёме больш за 2,2 млрд кВт.г, што ўдвая больш за ўзровень мінулага года.

У цэлым па ДВА «Белэнерга» прагназуецца выкананне ўсіх ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы за 2019 год.

Напрыклад, асваенне інвестыцый у асноўны капітал чакаецца ў аб'ёме не менш за 932,6 млн рублёў. Эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў за кошт рэалізацыі энергазберагальных мерапрыемстваў складзе каля 180 тыс. т умоўнага паліва. Эканамічны эфект ад выканання ключавога паказчыка па зніжэнні выдаткаў, павышэнні эфектыўнасці выкарыстання матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў прагназуецца на ўзроўні больш за 100 млн рублёў.

## Важны кірунак дзейнасці – экспарт паслуг

Пільная ўвага ўдзяляецца выхаду на новыя замежныя рынкі збыту паслуг. Актыўна прапрацоўваюцца такія напрамкі, як краіны Лацінскай Амерыкі (у прыватнасці Куба), Іран, Расійская Федэрацыя (Татарстан).

У мэтах наладжвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва сёлета ДВА «Белэнерга» наведалі каля 100 замежных дэлегацый з 21 краіны свету, прадстаўнікі буйных міжнародных арганізацый. У сваю чаргу, прадстаўнікі беларускай энергасістэмы здзейснілі больш за 90 візітаў за мяжу.

## Улік павінен быць дакладны

У рамках выканання Праграмы мадэрнізацыі сродкаў уліку электрычнай энергіі да 2023 года ажыццяўляецца замена ў бытавых абанентаў у існуючым жыллёвым фондзе індукцыйных прыбораў уліку электрычнай энергіі, у першую чаргу класа дакладнасці 2,5, на сучасныя электронныя прыборы ўліку. Усяго плануецца замяніць 3 500 000 прыбораў.

За тры кварталы 2019 года за кошт сродкаў энергазабеспячальных арганізацый у бытавых спажыўцоў заменена 302 884 прыборы ўліку. Усяго ў 2016—2019 гадах устаноўлена 1 381 779 электронных лічыльнікаў электрычнай энергіі. Толькі за 2017—2019 гады доля эксплуатаваных аднафазных электронных лічыльнікаў павялічылася з 28,53 % да 55,08 %.

Для аўтаматызацыі ўліку электраэнергіі электронныя лічыльнікі бытавых абанентаў аб'ядноўваюцца ў АСКУЭ-быт. Па стане на 1 кастрычніка 2019 года ў краіне створана 10 905 АСКУЭ-быт.

Прымяненне электронных лічыльнікаў і аб'яднанне іх у АСКУЭ-быт дае бытавым спажыўцам магчымасць разлічвацца за электрычную энергію па тарыфах, дыферэнцыраваных па часавых перыядах, і зніжаць свае выдаткі.

## Міжнародныя спаборніцтвы прафмайстэрства

**У разлікова-касавым цэнтры.**

У верасні ў Рэспубліцы Казахстан адбыліся чарговыя міжнародныя спаборніцтвы прафесійнага майстэрства персаналу электраэнергетычнай галіны дзяржаў — удзельніц СНД.

Удзел у іх узялі каманды васьмі краін. Каманда з РУП «Гроднаэнерга», якая прадстаўляла ДВА «Белэнерга», заняла першае месца. Раней такога ўдалага выступлення беларускіх энергетыкаў у спаборніцтвах за мяжой не было.

УНП 101339243

# КІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ ВЫЗНАЧАЕ ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС

## Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з генеральным дырэктарам РУП «Мінскэнерга» Алегам ШЧЭМЕЛЕМ

### Прадстаўляем суразмоўніка

*Малады выпускнік Беларускага політэхнічнага інстытута, які марыў звязаць свой лёс з энергетыкай, а таму і закончыў энергетычны факультэт прэстыжнай ВНУ, некалькі разоў спрабаваў самастойна працаўладкавацца ў разнастайныя энергетычныя арганізацыі на простую рабочую пасаду. І ўвесь час чуў шчыры адказ, што вакантных месцаў няма, бо работа таго ж электрыка адна з паважаных у грамадстве і вакансіі доўга не «гуляюць». Нарэшце настойлівасць дала плён, і ён быў прыняты слесарам у брыгаду па рамонце электрарухавікоў, а з улікам інстытуцкага дыплома хлопцу быў прысвоены 4-ы рабочы разрад. Кадравік увайшоў у становішча і як бы нават паспачуваў: крыху папрацуеш, пакажаш сябе, і прызначым майстрам, а там і начальнікам цэха, а то і галоўным інжынерам будзеш. Як у воду глядзеў вопытны кадравік, бо маштаб асобы ўчарашняга студэнта адчуў дакладна. Праз некаторы час былы студэнт сапраўды працаваў майстрам, а праз год пачаў расці па службовай лесвіцы. Неўзабаве перайшоў на аператыўную работу — стаў начальнікам змены электрацэха, начальнікам змены ўсёй станцыі, начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела. А пасля — намеснікам галоўнага інжынера па эксплуатацыі, і кіраўніцтва аператыўнай работай лягло на яго плечы. Наступныя прыступкі кар'ернай лесвіцы — галоўны інжынер станцыі, намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Белэнерга».*

*З кастрычніка гэтага года Алег ШЧЭМЕЛЬ — генеральны дырэктар РУП «Мінскэнерга».*

— За нармальным функцыянаваннем усёй сістэмы «Мінскэнерга» стаіць надзвычай высокатэхналагічны комплекс, які дазваляе ажыццяўляць бесперабойнае энергазабеспячэнне шматлікіх спажыўцоў, — пачаў свой расказ генеральны дырэктар. — І стаіць напружаная праца амаль 15 тысяч работнікаў нашага калектыву, што абслугоўваюць гэты комплекс. Як вынік, сёння РУП «Мінскэнерга» выпрацоўвае каля трыццаці працэнтаў электраэнергіі, што вырабляецца ў краіне, і цеплавой энергіі, што адпускаецца ў сістэме ДВА «Белэнерга». Калі ў лічбах, то гэта больш за 10 мільярдаў кілават-гадзін электраэнергіі і больш за 12 мільёнаў гігакалорый цяпла. Устаноўленая магутнасць 2 тысячы 419 мегават, гэта амаль 30 працэнтаў ад устаноўленай магутнасці ўсёй энергасістэмы Беларусі. У нас 15 філіялаў, станцыі высокага ціску — мінскія ЦЭЦ-3, ЦЭЦ-4, якая яшчэ нядаўна была адной з найбуйнейшых у Еўропе, і ЦЭЦ-5, а таксама Мінская ЦЭЦ-2, Жодзінская і Барысаўская ЦЭЦ, шэраг буйных раённых кацельняў і мініЦЭЦ.

Схема цеплазабеспячэння Мінска і вобласці ўнікальная і адзначалася ўзнагародамі вялікай краіны. Адных электрасетак тут 68 тысяч кіламетраў — больш чым паўтара экватара. І 2995 кіламетраў цеплавых сетак, з якіх 2400 кіламетраў знаходзіцца ў Мінску. У аднатрубным пераліку гэта больш за 40 працэнтаў ад цеплавых сетак краіны. І 23 працэнты ад агульнай колькасці падстанцый.

***— Алег Анатолевіч, калі вызначаць прыярытэты вашай работы, то...***

— То на першым плане стаіць бяспека персаналу і людзей, якія нас акружаюць. І — надзейнасць работы. А ўжо потым яе эфектыўнасць. І ніяк па-іншаму. Хоць усе гэтыя тры пазіцыі раўназначныя, скажам так. Менавіта захаванне іх разумнага балансу дазваляе нам выконваць усе даведзеныя, кантралюемыя, сацыяльна значныя паказчыкі работы.

Што датычыцца эфектыўнасці — у нас распрацавана праграма па энергазберажэнні, дзякуючы ажыццяўленню мерапрыемстваў якой за гэты год мы змаглі сэканоміць 60 тысяч тон умоўнага паліва пры плане 58 тысяч. Зніжаны выдаткі, у гэтым кірунку працуем сур'ёзна, і атрымана зніжэнне страт электрычнай і цеплавой энергіі. Страты электраэнергіі сёлета складаюць 8,68 працэнта, летась яны былі 8,95 працэнта. Па цяпле адпаведна 11,67 і 11,97 працэнта. Хоць пакрысе, але ідзе зніжэнне — за кошт мадэрнізацыі, замены цепласетак на папярэдне ізаляваныя трубы, за кошт рэканструкцыі электрасетак.

***— Назіраецца простая заканамернасць: каб працаваць эфектыўна, вам трэба пастаянна займацца рэканструкцыяй.***

— І мадэрнізацыяй вытворчых магутнасцяў. Лічу, што тут мы ідзём у нагу з часам, — у свой час грунтоўна прапрацавалі пытанні мадэрнізацыі электрычных сетак і яшчэ ў 2007 годзе ўпершыню ўвялі на падстанцыі «Вяснянка» камплектную размеркавальную прыладу, у выніку чаго падстанцыя працуе з мінімальным умяшаннем чалавека. А следам за гэтым увялі такія размеркавальнікі і на «Падлеснай», і ў «Пятроўшчыне», і на «Нямізе». Усе гэтыя падстанцыі звязаны 110-кілавольтным кабелем з шытага поліэтылену, і з таго ж 2007 года ніводная такая кабельная лінія не пашкодзілася.

Каманда пераможцаў спаборніцтваў пад эгідай МНС.

Ажыццяўляецца Галіновая праграма развіцця электраэнергетыкі на 2016—2020 гады з яе салідным пералікам найважнейшых інвестыцыйных праектаў. Напрыклад, ужо сёлета з удзелам кітайскіх інвестараў рэканструявалі падстанцыю 330 кілавольт «Паўночная». Увялі яе ў лік дзеючых сёлета, што дазволіла гарантаваць надзейнасць работы ўсяго энергавузла ў раёне Навінак. Тыдзень таму завяршылі рэканструкцыю і датэрмінова ўключылі адзіную ў краіне лінію з напружаннем 750 кілавольт на падстанцыі «Беларуская», што ў Старадарожскім раёне, праз яе ажыццяўляецца сувязь са Смаленскай атамнай станцыяй, і на яе ж будуць ускладзены адказныя задачы ў сувязі з пускам Беларускай АЭС. А ўсяго за дзевяць месяцаў 2019 года ўведзена ў эксплуатацыю 194 аб'екты.

Адзін з кірункаў дзейнасці — адыход ад напружання 220 кілавольт у бок 330. Бо чым вышэйшае напружанне, тым меншыя страты электраэнергіі. У такім кірунку мы цяпер працуем на падстанцыі ў Стоўбцах, пераводзім яе на 330. І там таксама будзе сувязь з атамнай станцыяй. Першую і другую чаргу зрабілі, «чаруем» над трэцяй і чацвёртай — лініяй Стоўбцы — Баранавічы.

І ёсць дзяржаўная праграма, накіраваная на ўзровень павышэння камфорту насельніцтва, яна так і называецца — «Камфортнае жыллё», у рамках яе сёлета будзе асвоена 5,5 мільёна рублёў бюджэтных сродкаў для развіцця і рэканструкцыі электрасетак на вёсцы. Яна таксама грунтуецца на найноўшых тэхнічных і тэхналагічных распрацоўках і датычыцца ў тым ліку пераабсталявання нашых падстанцый. Гэта ў ліку іншага дазволіць скараціць час на адключэнне электрычнай і цеплавой энергіі. Цяпер сярэдняя працягласць адключэння спажыўцоў па «Мінскэнерга» — 1,04 гадзіны. (Па «Белэнерга» — 1,3 гадзіны.) Гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у абласных сістэмах.

МЦЭЦ-3.

Што датычыцца нашага жадання ісці ў нагу з часам, сёлета ў РУП «Мінскэнерга» знаходзіцца ў доследнай эксплуатацыі аўтаматызаваная сістэма дыспетчарскага кіравання на базе аператыўна-інфармацыйнага комплекса СК-2007. Гэта дазволіць перайсці на сучасны ўзровень функцый кіравання работы нашых электрычных сетак і абсталявання.

Створана адзіная геаінфармацыйная сістэма (ГІС) спадарожнікавага маніторынгу транспарту на базе праграмнага забеспячэння «Азімут-2». З яе дапамогай ужо на ўзроўні раённых электрасетак праз спадарожнікі мы больш эфектыўна кіруем работай аператыўных аднаўленчых брыгад, якія выязджаюць на выклік, і іншай спецтэхнікі — нават без выкарыстання сеткі «Інтэрнэт».

Прынята і пачала дзейнічаць праграма лічбавізацыі падстанцый, і ў сярэднім адну-дзве сеткі ў год адпаведна рэканструюем. Нядаўна правялі рэканструкцыю Барысаўскага сельскага РЭСа, заканчваем Салігорскага сельскага РЭСа і рухаемся ў гэтым кірунку далей.

Са з'яўленнем лічбавых падстанцый зусім новае значэнне набывае паняцце «сучасная абарона сетак» — гэта ўжо мікрапрацэсарная абарона, пры якой у выпадку неабходнасці адключэнне ліній, аб'ектаў адбываецца імгненна, а не праз пэўны адрэзак часу, пакуль уручную ці нават у аўтаматычным рэжыме адключацца рэле. А мінімізацыя часу адключэння забяспечвае меншае разбурэнне, пашкоджанне тых жа ліній і хутчэйшае аднаўленне рэжымаў работы. Кабельныя сістэмы, што аджылі свой век, замяняе оптавалакно. Укараняюцца сістэмы АСКУЭ — аўтаматызаваныя сістэмы кантролю і ўліку электраэнергіі. А лічыльнікі на пляцоўках паміж паверхамі жылых шматкватэрных дамоў, што адслужылі сваё, замяняюцца больш сучаснымі, і разліччыцца за карыстанне электраэнергіяй можна праз ЕРЫП ці нават з мабільнага тэлефона. Гэта зручна для карыстальніка. Пераход на сучасныя метады кантролю і разлікаў — таксама элемент пераходу на лічбавізацыю.

***— Не можам абыйсці і такую тэму: у апошнія гады ўсё часцей умовы надвор'я выпрабоўваюць вас на трываласць...***

— Такое сапраўднае выпрабаванне адбылося ў 2016 годзе, калі экзаменавалі нас цыклоны «Данізла» і «Эма». Аўтатранспарт і людзі не маглі рухацца, дарогі былі завалены дрэвамі. А яшчэ штогод у прыродзе адбываецца так званы «пераход праз нуль», калі плюс мяняецца на мінус і ідзе «ледзяны дождж». Вільгаць на правадах і дрэвах пасля зніжэння тэмпературы ператвараецца ў лёд, дрэвы падаюць, высакавольтныя лініі «страляюць» і гэтак далей. І кожны раз гэта сапраўдны экзамен на ўменне арганізаваць работу. У такіх выпадках згуртоўваецца ўся энергасістэма, брыгады працуюць на лініях, кіраўнікі і спецыялісты таксама на «вайсковым становішчы», без сну і адпачынку. Калі параўнальна нядаўна такі сапраўдны разгул стыхіі адбыўся, напрыклад, у Старадарожскім раёне, то тады за пяць дзён круглясутачнай вахты, якую нёс калектыў, давялося памяняць адразу 287 апор паветраных ліній 10 кв і аднавіць 19,6 кіламетра ліній электраперадачы. У нармальных умовах гэтыя аб'ёмы работы дзвюма брыгадамі занялі б не менш за месяц. А тады вельмі хутка засілкавалі ўсіх спажыўцоў, дзе спатрэбілася — падключылі дызелі з усёй энергасістэмы. І гэта быў рэальны подзвіг нашага персаналу.

***— Што ў перспектыве, Алег Анатолевіч?***

— Ужо з 2020 года, магчыма, давядзецца ўдзельнічаць у стварэнні агульнага электраэнергетычнага рынку Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС), рыхтуемся да выканання няпростай місіі. Працягваем працаваць па дзяржаўнай праграме «Камфортнае жыллё» стварэння належнай інфраструктуры для жылля. У тым ліку распрацаваны і зацверджаны аблвыканкамам перспектыўныя планы выкарыстання электраэнергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння жылых дамоў.

Сур'ёзная работа праведзена і праводзіцца па інтэграцыі ў нашу энергасістэму Беларускай атамнай станцыі. У прыватнасці, з нашым удзелам пабудаваны новыя лініі, зроблена мадэрнізацыя дзеючых, праведзена рэканструкцыя мінскіх ЦЭЦ-2 і ЦЭЦ-3. Энергасістэма Мінска і Мінскай вобласці гатова да падключэння да нас атамнай станцыі. А ў 2020 годзе мы павінны паставіць электракатлы агульнай магутнасцю 360 мегават для забеспячэння ўстойлівай работы сістэмы, калі АЭС будзе працаваць у ашчадным рэжыме, як і прадугледжана яе графікам.

Ну і плануецца выконваць у год каля 300 кіламетраў будаўніцтва і рэканструкцыі электрычных сетак, а не менш за 250 кіламетраў цепласетак за пяць гадоў павінны памяняць. Акцэнт пры гэтым робіцца на папярэдне ізаляваныя трубы, якія і эканамічныя, і эфектыўныя — увогуле надзейныя ў эксплуатацыі.

Клапоцячыся пра тэхніку, пра сеткі і іх рэканструкцыю, не забываем пра галоўную каштоўнасць — сваіх людзей. Раскрываць максімальна патэнцыял калектыву дапамагае пераемнасць пакаленняў. Стала правілам, што, перш чым пайсці на заслужаны адпачынак, прызнаны майстар павінен падрыхтаваць сабе вартую замену. Праводзіцца і традыцыйнае працоўнае навучанне, калі за перадавіком замацоўваецца малады работнік. Мае месца наватарства, у вялікай пашане ветэраны. Яны ведаюць, што на родным прадпрыемстве пра іх памятаюць і ў любой сітуацыі прыйдуць на дапамогу.

Нашы працаўнікі — наша сіла, вось чаму ажыццяўляецца актыўнае сацыяльнае партнёрства. Карпаратыўная палітыка перш за ўсё скіравана на захаванне здароўя членаў калектыву, хаця б таму, што 60 працэнтаў яго складу працуе ў шкодных умовах, а гэта амаль дзевяць тысяч чалавек. Сумленную працу нашых людзей адзначаем не толькі мы, але і кіраўніцтва галіны, краіны. Пачынаючы з 2018 года сем чалавек з нашай энергасістэмы ўзнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». А яшчэ мы лічым, што ўсе разам павінны быць бліжэйшыя да насельніцтва. Ніводзін выпадак нейкага непаразумення паміж нашымі работнікамі і спажыўцамі не застаецца без аналізу. Кожны зварот разглядаецца шматбакова, і мы не дапускаем, каб ён паўтарыўся.

Наша прадпрыемства важнае для гарадскога бюджэту як падаткаплацельшчык, ужо сёлета мы заплацілі 334 мільёны рублёў падаткаў. Уваходзім у пяцёрку найбуйнейшых плацельшчыкаў падаткаў краіны. Нейкі дзясятак гадоў таму, каб пабудаваць той ці іншы аб'ект, мы павінны былі браць буйныя крэдыты. Цяпер будуем, развіваемся і ажыццяўляем важкія інвестыцыйныя праекты ў асноўным за ўласныя сродкі. Працаваць стараемся кваліфікавана, упэўнена, вось чаму з намі заўсёды цёпла і светла.

Дазвольце праз найстарэйшую беларускую газету павіншаваць калектыў, калег і дзелавых партнёраў з прафесійным святам і шчыра пажадаць новых працоўных поспехаў, новых прафесійных вышынь, дабрабыту, аптымізму, здароўя! Няхай усе планы, нават самыя грандыёзныя, знойдуць сваё ўвасабленне ў жыцці, стануць рэальнасцю.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**

УНП 100071593

На экранах

# 25-Ы КАДР КАЛЯДНАЙ ГІСТОРЫІ

## Як у простым рамантычным сюжэце адлюстроўваецца сусветны парадак дня

**Сёлетні перадсвяточны кінапракат прапануе стварыць адпаведны настрой і чакаць якіх-ніякіх цудаў з дапамогай фільма «Каляды на дваіх» Пола Фіга, куды з эпасу «Гульня тронаў» прыйшла Эмілія Кларк, а з «Шалёна багатых азіятаў» — Генры Голдынг. Гэта пра галоўныя ролі, а апроч іх у фільме сыгралі Эма Томпсан, якая дзе толькі не знялася, а таксама Мішэль Ёа, вядомая хаця б па «Мемуарах гейшы». Такі мілы і падкрэслены еўрапеоідна-азіяцкі каст увасобіў простую гісторыю пра легкадумную дзяўчыну, якая плявала на сваё жыццё, але змянілася праз закаханасць. І падаспела якраз на Каляды.**

У маладой спадарыні Кейт, якая некаторы час таму перажыла складаную аперацыю і мусіць клапаціцца аб сваім здароўі, непаразуменні з усім на свеце: з-за дрэнных стасункаў з маці яна сыходзіць з бацькоўскага дома, начуе то ў сяброўкі, то ў выпадковага хлопца, да якога раніцай прыходзіць каханая, правальвае праслухоўванне, падводзіць гаспадыню крамы святочных аксесуараў, дзе працуе прадаўцом, і канчаткова псуе адносіны з сястрой.

Апроч таго, што Кейт натуральна ўвесь час трапляе ў гісторыі — ну такі чалавек, — яна дэманструе свядомую абыякавасць да свайго жыцця і пачуццяў іншых — прапускае візіты да ўрача, выпівае, вячэрае фаст-фудам, адным словам, адмаўляецца сур'ёзна ставіцца да сур'ёзных рэчаў. Але ў пэўны момант яна сустракае Тома, які паказвае ёй быццам новы свет, толькі рэгулярна некуды знікае.

Хоць «Каляды на дваіх» і не з'яўляюцца традыцыйнай гісторыяй кахання з вяселлем у якасці канцоўкі, свой хэпі-энд тут усё ж такі будзе — гэта ж калядны фільм, і галоўным яго складнікам стане тое, як Кейт паступова выправіць усе былыя касякі, бо праз каханне стане лепшая. Так, гэта таксама крыху банальна, альбо, давайце скажам, класічна. Такія трансфармацыі, шляхі ад татальнай няўдачы і запушчанасці да шчасця і хараства чапляюць гледачоў з давён-даўна, нават калі яны прыкладна ўяўляюць, чым скончыцца гэтае кіно.

Гісторыя лакавая (з той катэгорыі фільмаў, калі незразумела, як з такім рэжымам галоўная гераіня захоўвае ідэальныя локаны) і, паўтаруся, абсалютна простая: мы маем героя, які павінен выправіцца, мы маем рамантычнага прынца, мы маем перашкоды, мы маем жарты, сантыменты, слёзы, прызнанні, пяшчотны пацалунак, песні Джорджа Майкла і неахопны аб'ём святочнай ілюмінацыі. Да таго ж тут вельмі шмат Каляд, а гэта так дарэчы — галоўная гераіня разгульвае ў касцюме эльфа, калядная крама цягне на рэзідэнцыю Санта Клаўса, персанажы і свет мяняюцца па маленькім святочным чараўніцтве.

У той жа час па быццам простай кінакарціне раскіданыя даволі цікавыя дэталі, хаця б той жа мікс амерыканцаў/брытанцаў і азіятаў, што чарговы раз сведчыць пра цікавасць вялікага заходняга кіно да Усходу (тыя ж «Шалёна багатыя азіяты» 2018 года, дзе Генры Голдынг выканаў галоўную ролю, былі лідарамі амерыканскага пракату). І цікавасць не толькі да Азіі: у біяграфію галоўнай гераіні ўвернута зусім непатрэбная для сюжэта, але патрэбная для кан'юнктуры дэталь — паходжанне з Югаславіі, адкуль яе сям'я вымушана была ўцякаць. Так калядная гісторыя нібы незнарок адлюстроўвае цяжкія выпрабаванні эмігрантаў, якія прыстасоўваюцца да новай краіны і з юрыстаў ператвараюцца ў кіроўцаў таксі. «Гэта ўсё палякі», — каментуе маці Кейт навіны, што, на яе думку, мусяць паўплываць на яе статус грамадзяніна, але, дзякуй богу, жарт аказваецца дарэчны і ненавязлівы.

З «Калядамі на дваіх» не забудзеш, якім натуральным пытаннем сёння з'яўляецца масавая эміграцыя. Умоўным 25-м кадрам гэтага святочнага сюжэта, апроч згаданага, становяцца і нетрадыцыйная сексуальная арыентацыя альбо донарства ў медыцыне. Так што глядач ідзе па святочны настрой, а апроч яго атрымлівае прыкладнае ўяўленне пра сённяшні сусветны парадак дня.

Каляднае чараўніцтва дасягне сваёй кульмінацыі ў цэнтры, што дапамагае бяздомным, і яны, вядома ж, таксама будуць мець пэўную чароўнасць, няма чаго і гаварыць пра антуражы фільма і знешнасць галоўных герояў. Усё ў гэтай карціне прыгожа і нерэалістычна — што казаць, камерцыйны праект, але можа быць, гэтая казка — якраз тое, што трэба перад таксама крыху містычным святам Каляд. Шукайце ў пракаце да 25 снежня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

## Даты Падзеі Людзі

### 19 СНЕЖНЯ

У краіне

**1919** год — нарадзілася Таццяна Мікалаеўна Барамзіна, Герой Савецкага Саюза (1945, пасмяротна). У Вялікую Айчынную ваявала на 3-м Беларускім фронце — тэлефаністка батальёна. У баі каля вёскі Пекалін Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці 5 ліпеня 1944 года знішчыла са снайперскай вінтоўкі 20 гітлераўцаў, аказвала дапамогу параненым. У гэтым баі захоплена ў палон і расстраляна.

**1919** год — нарадзіўся Пётр Якаўлевіч Маглыш, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Слуцкага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З першых яе дзён удзельнічаў у абарончых баях пад Беластокам. Быў паранены, трапіў у палон, уцёк, у кастрычніку 1941 года вярнуўся ў акупаваны Слуцк і ўключыўся ў падпольную работу. Яго дом быў партызанскай базай: тут праходзілі сустрэчы, рамантавалася зброя, вырабляліся міны. Загінуў у 1943 годзе.

**1919** год — нарадзіўся Мікалай Макаравіч Пятрэнка, беларускі дзеяч аматарскага мастацтва, кампазітар, педагог, заслужаны настаўнік Беларусі (1966). Аўтар зборнікаў песень на вершы беларускіх паэтаў, у іх ліку «Беларусі мілай».

**1934** год — нарадзіўся Аляксей Ігнатавіч Мікуліч, беларускі вучоны ў галіне антрапалогіі, экалогіі, доктар біялагічных навук (1991). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998).

**1969** год — уступіў у строй Трэці Салігорскі калійны камбінат. У гэты ж дзень былі адкрыты першыя ў Беларусі радовішчы бурага вугалю каля горада Жыткавічы.

У свеце

**1874** год — нарадзілася Яўгенія Міхайлаўна Студзенская, расійская паэтэса, перакладчыца, аўтар слоў песні «Врагу не сдается наш гордый «Варяг».

**1924** год — нарадзіўся Мішэль Турнье, французскі пісьменнік. Аўтар раманаў «Лясны цар», «Метэоры» і іншых.

**1944** — нарадзілася Настасся Аляксандраўна Вярцінская, расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Расіі (1988). Здымалася ў фільмах «Пунсовыя ветразі», «Вайна і мір», «Ганна Карэніна», «Гамлет» і іншых.

**1954** год — прадстаўнікі ўрадаў краін — членаў Савета Еўропы падпісалі Еўрапейскую культурную канвенцыю. Увайшла ў сілу 5 мая 1955 года.

**1972** год — на Зямлю вярнуўся экіпаж амерыканскага касмічнага карабля «Апалон-17». Астранаўты Юджын Сернан і Харысан Шміт правялі на паверхні Месяца рэкордны час — 74 гадзіны 59 хвілін 40 секундаў. Гэтым палётам завяршылася амерыканская месячная праграма.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.25 | 16.48 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.22 | 16.30 | 7.08 |
| Магілёў — | 9.15 | 16.38 | 7.23 |
| Гомель — | 9.03 | 16.43 | 7.40 |
| Гродна — | 9.39 | 17.05 | 7.26 |
| Брэст — | 9.31 | 17.14 | 7.43 |

## Месяц

***Апошняя квадра ў 7.56. Месяц у сузор'і Шаляў.***

## Імяніны

***Пр.*** *Максіма, Мікалая.*
***К.*** *Дар'і, Элеаноры, Габрыэля, Рыгора, Урбана.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Гараскоп на заўтра.**
**У аптымістаў усё будзе дрэнна, але яны гэта не заўважаць. У песімістаў усё будзе добра, але ім гэта зноў не спадабаецца.**

— Добры дзень, мне патрэбны сродак супраць загару.

— Вось, трымайце (працягвае паперку).

— Што гэта?

— Шасцідзённы рабочы тыдзень у офісе.

**Я пасварыўся з жонкай праз тое, што, калі мы валяемся на канапе, я варочаюся і яна не можа прыхіліць да мяне планшэт, каб спакойна глядзець свой серыял пра жанчыну, якая забіла мужа.**

Дзяўчына — хлопцу:

— Будзеш дрэнна сябе паводзіць, я за цябе замуж выйду і жыць у цябе застануся.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4272.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12